а. Рыгор Сасна ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Царская Орля (2) ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 16 (2762) Год LIV | Беласток, 19 красавіка 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Следам прызвання

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Змаганне суправаджае чалавечае жыццё. Гэта змаганне паміж любоўю і самалюбствам. Любоў у адступленні.

Мой жыццёвы досвед падказвае, што хрысціяне асабліва думаюць пра Бога толькі, у прынцыпе, двойчы ў год: у Ражджаство і Вялікдзень. Ну, і, вядома, калі здарыцца нейкае няшчасце ў найбліжэйшым акружэнні, паводле народнай мудрасці: „Калі трывога, то да Бога". Факт — слова „Бог" людзі ўжываюць штодзённа, забываючы, што Свяшчэннае Пісанне забараняе ўжываць яго „всуе" — дарэмна. Але ёсць людзі, якія Богу прысвячаюць вялікую долю свайго жыцця.

Орля, 1990-я гады. Вынясенне плашчаніцы ў Вялікую пятніцу

Па-мойму, прызванне, гэта перакананне, што трэба трымацца нейкага акрэсленага ладу жыцця. Бог у сваёй вялікай дабрыні дае людзям мноства дароў, напрыклад, сілу, здароўе, мудрасць. Чалавек быў першым адлюстраваннем Бога. Нашы істоты Бог стварыў на свой вобраз і падабенства і вызначыў кожнаму чалавеку нейкае даручэнне, місію. Кожны чалавек мае нейкі Божы дар, які нас радуе, які трэба берагчы і памнажаць — дзякуючы такім чынам Богу — раздзяляючы яго з іншымі.

Некаторыя людзі служаць Богу ў якасці місіянераў, манахаў, пустэльнікаў, святароў ці катэхетаў. У некаторых гэта частка доўгай сямейнай традыцыі, іншыя прывязваюцца да Царквы з наймалодшых гадоў. Заўважаю таксама, што такая прывязанасць часам бывае метадам пракладкі жыццёвай дарогі, ангажавання — афіцыйнага ці неафіцыйнага — у палітыку розных узроўняў.

Калі я вучыўся ў сярэдняй школе, адзін мой аднакласнік прызнаваўся мне, што марыць мець маёнтак і багацце каб яго паважалі. Меў ён вясёлы і лагодны характар, не прападаў за мацнейшымі прысмакамі, але вельмі цягнула яго да дзяўчат. Нішто не прадвяшчала, што адыдзе ён ад вывучанай прафесіі механіка. Але так здарылася, што апынуўся ён у Амерыцы, дзе стаў бацюшкам.

Да прызвання адносяцца па-рознаму нават асобы духоўныя. Вось такі адзін мой знаёмы здзівіўся перада мною: „Прызванне — а што ж гэта такое?" А я не мог яму адказаць, бо і сам не ведаю адказу на такое пытанне. І мы пакінулі гэтую тэму.

Мне асабіста сфера духоўнасці таемная, іншая ад рэчаіснасці, задзіўляючая і прыцягальная. Хаця я ад яе збоку, то ўсё ж люблю пра духоўнасць чытаць, пісаць, гутарыць з людзьмі, а найбольш люблю фатаграфаваць; лічу, што гэта таксама мой атрыманы ад Бога дар. Ад трыццаці гадоў сістэматычна фатаграфую падзеі з жыцця Арлянскага прыхода, важнейшыя святы, візіты іерархаў, прыхаджан, збудаванні. Мяркую, што ў недалёкай будучыні ўдасца мне наладзіць фотавыставу і мультымедыйную прэзентацыю, у тым ліку і з маімі ніўскімі артыкуламі на гэтую тэму. Бо ж, можна так сказаць, і „Ніва" спрыяе майму дару ад Бога.

У Орлі

Настаяцель Арлянскага прыхода а. мітрат Аляксандр Такарэўскі, народжаны ў 1929 годзе, прызнаўся мне:

— Святарскае прызванне, мабыць, было ў мяне з дзяцінства. Вялікае значэнне меў таксама і той факт, што некаторыя мае сямейнікі здаўна працавалі ў карысць Царквы. Дзед Пётр Такарэўскі быў псаломшчыкам у Корніцы. Дзядзька быў святаром у Бельску-Падляшскім і шмат часу выконваў абавязкі благачыннага. І мой лёс так склаўся, што пасля смерці бацькі ў 1942 годзе жыў я ў свайго дзядзькі, які тады быў святаром у Мілейчычах. Ён ставіўся да мяне як да роднага сына, быў мне аўтарытэтнай асобай. Любіў я гутарыць з ім на розныя тэмы, суправаджаць яго ў ягоных вандроўках. Сістэматычна наведваў я царкву, удзельнічаў у службах: чытаў, спяваў, прыслугоўваў. Ужо тады вывучыў я „Часаслоў" на памяць. Усё гэта мела ўплыў на маё святарскае прызванне.

Айцец Аляксандр Такарэўскі служыць у Орлі ўжо сорак сем гадоў — з 1962 года! Тут людзі яго вельмі паважаюць за сумленнасць, добрае кіраванне прыходам і — асабліва — за сардэчныя і ўважлівыя адносіны да іх.

З Арлянскага прыхода выводзіцца многа святароў, у іх ліку і сын настаяцеля Георгій; шмат з вёскі Пашкоўшчына. Фама Стэмпа з Тапчыкал, які тэалогію вывучаў у Варшаве і Румыніі, прызнаваўся мне, што ягоныя жыццёвыя планы фарміраваліся з дапамогай нашага настаяцеля, калі з пятага-шостага класа пачатковай школы аж да трэцяга класа ліцэя прыслугоўваў у арлянскай царкве, пазней прымаў удзел у з'ездах праваслаўнай моладзі ў Грабарцы, паломнічаў з беластачанамі і гайнавянамі. Айцец Фама падкрэсліваў: „Вельмі важна не забываць пра сваю рэлігію, пра атрыманую ў спадчыне ад продкаў веру. Трэба працягваць традыцыю і рупіцца пра сваё духоўнае развіццё. Нельга забываць, што на першым месцы Бог, бо тады ўсё будзе складвацца па Ягонай і нашай волі".

Людзі, прагныя ідэальна здзяйсняць прынцыпы сваёй рэлігіі, яднаюцца ў ордэны. З Арлянскага прыхода выводзяцца таксама многія манахі і манашкі з Шарнёў, Крывятыч, Вулькі ці Орлі.

Людміла КЕБІЧ

Вялікдзень

Божа Магутны!
Усё з Твае ласкі.
Мы дачакаліся
Светлае Пасхі.
Ежы святочнай
З чубам талеркі,
Дзеці на вуліцы
скачуць у „бэрка".
Светлай нядзелькай
З самага рання
свет захліснула
хваляй кахання.
Будзіць матуля –
час разгавецца!
Песня святая
З неба ліецца:
Хрыстос уваскрос!
Хрыстос уваскрос!
Хрыстос уваскрос!

9 770546 196000

Традыцыя

Для беларусаў стагоддзямі было натуральным тое, што мы азначаем два разы ў год галоўныя рэлігійныя хрысціянскія святы. Па юліянскім календары і па грыгарыянскім. І такое свята як Вялікдзень таксама. І нават сённяшняя дзяржаўная ўлада, якую западозрыць у павышаных сімпатыях да рэлігіі мякка кажучы цяжкавата, вымушана прызнаваць і адну, і другую дату чырвонымі днямі календара. І толькі час ад часу каталіцкі і праваслаўны Вялікдзень супадае на адну і тую ж дату, нібыта каб наўмысна паказаць, што мы ўсё ж адзін народ, якому па вялікай Ласцы Божай дадзена гэтая наша зямля. Зямля, на якой трэба разам жыць і памятаць сваю хрысціянскую веру, сваіх продкаў і свае, агульныя і для каталікоў, і для праваслаўных, народныя беларускія традыцыі.

У Беларусі, недзе на ўзроўні крыві, генаў і падсвядомасці гэта ведалі заўжды. І пакуль каталіцкія і праваслаўныя царкоўныя чыны спрачаліся, чый каляндар больш правільны, простыя беларусы казалі, што Бог для ўсіх адзін і шчыра віншавалі адны другіх з найвялікшымі хрысціянскімі святамі.

І гэта, хіба што, самая цікавая святочная народная традыцыя, якую стварылі беларусы. Памятаю яе з дзяцінства, калі бацькі, нам, праваслаўным, наказвалі павіншаваць каталіцкіх суседзяў. А тыя, як прыходзіў час, не забываліся павіншаваць нас. І гэта адна з нямногіх народных традыцый, якая перажыла ўсе няўзгоды, усе спробы спекулявання рэлігійнымі пачуццямі, усе намаганні раздзялення беларусаў па рэлігійнай прыкмеце, і якая захавалася ажно па сённяшні дзень.

Сёння на Гродзеншчыне, а асабліва ў самым абласным цэнтры, народныя традыцыі святкавання рэлігійных святаў больш можна пабачыць па тэлебачанні, чым насамрэч напаткаць на вуліцы. На вёсках жаданне захаваць былое яшчэ жыве. Але ў гарадах, на жаль, людзі больш схільныя да занядбання сваіх каранёў. Але гэтая традыцыя, традыцыя віншавання з Вялікаднем не толькі тых, хто спавядае тую рэлігію як ты сам, але і знаёмых іншай канфесіі — засталася.

Так сталася, што царкоўныя традыцыі ў нас засталіся больш трывалымі, чым народныя. І як стагоддзі таму зноў заб'юць званы на храмах ды пачнецца служба. Адмыслова для свята зменіцца царкоўны інтэр'ер. Тысячы вернікаў прыйдуць асвяціць чырвоныя яйкі. Але велікодныя песні прыйдзецца пачуць па радыё або тэлебачанні, а не з вуснаў тых, хто сядзе за стол адзначыць свята. І толькі ў памяці застаецца, як клікаў мяне, яшчэ няспелага хлапчука мой бацька, каб я мог паслухаць валацоўнікаў, якія гучнымі галасамі спявалі песні, славілі Бога, і на ўсю ваколіцу разносілася іх сцвярджальнае: „Хрыстос Уваскрэс". Я сваім дзецям такога паказаць ужо не ў стане.

І нават такая аптымістычная і вясёлая традыцыя, як тройчы, шчыра і ад усяго сэрца пацалаваць кожнага знаёмага і кожнага госця, таксама ўжо слабее і не вытрымлівае выпрабавання часам. Людзі ўжо ўкладаюць хіба што не той сэнс у такія пацалункі, а некаторыя ўвогуле не разумеюць іх значэння. Таму хутка яе можна будзе ўбачыць толькі ў мастацкіх фільмах пра жыццё нашых дзядоў. І то, толькі ў тым выпадку, калі сцэнарысты ды рэжысёры не забудуцца, які масавы і велічны характар яна калісьці мела.

Ды нават яйкі ўжо больш не ўсе размалёўваюць самі. Прасцей купіць прыгожыя наклейкі ды хутка ўпрыгожыць імі велікоднае яечка. Тое, што наклейка сінтэтычная і не дазваляе дзецям, як некалі, некалькі дзён біцца яйкамі, каб вызначыць, у каго яно мацнейшае, таксама мала каго хвалюе, уключаючы і саміх дзяцей. Хіба і гэтая традыцыя, якая і зараз ёсць найбольш масавай, церпіць пэўныя змены і стаўленні да яе.

А традыцыя віншавання праваслаўнымі каталікоў і наадварот, з кожным годам мацнее. Відаць, беларуская нацыя адчула прагу да еднасці, засумавалася па ёй і шукае не розніцы, а агульнага ў кожным з яе прадстаўнікоў, каб з'яднацца і разам супрацьстаяць агульным праблемам, каб разам зрабіць сваю Беларусь моцнай і квітнеючай. І тое, што гэтая нацыянальная традыцыя актывізуецца якраз на рэлігійныя святы не пакідае сумневаў, што так яно і будзе.

Віктар САЗОНАЎ

Адчуванні па сустрэчы

20 сакавіка 2009 года ў 8 гадзін раніцы разам са спадарствам Эдуардам і Валянцінай Швайко з Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку выехалі мы на машыне з Беластока ў Гайнаўку. У Гайнаўцы я апошнім часам быў роўна 3 гады таму, 20 сакавіка 2006 года, і вельмі прыемна ўспамінаю гэтую сустрэчу. Зараз таксама настаўнікі беларускай мовы ды сімпатычныя бібліятэкаркі з Гайнаўскага белліцэя памяталі пра маю скромную асобу і зноў запрасілі мяне на сустрэчу ў сувязі з маім новым зборнікам. Паважанымі рэдактарамі зборнічка былі праф. Галіна Твароновіч і праф. Ян Чыквін. Дзякуючы ім, а перш за ўсё спадару Аляксандру Карачуну — дырэктару Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку, мае навейшыя вершы ўбачылі новы дзень і ад гэтага перажываю вялікую радасць. Нявыспанаму, стомленаму пасля 16 гадзін працы ўночы ды і асавеламу ад многіх незнаёмых маладых прыгожых дзявочых твараў, не хацелася мне замнога гаварыць ці з жартам, ці з большым одумам. Лепш чыталіся вершы з абодвух зборнікаў — „Самота дажджу" (2009) і „Субота ў Малінніках" (2005). На пачатку голас у мяне быў ціхі, але паправіўся на просьбу гарэзлівых шэптаў хлопцаў, якія смяяліся найгучней, бо сядзелі ззаду публікі. Дзяўчаты больш уважліва слухалі і іх было больш чымсьці хлопцаў. Прыгожыя, мілыя твары маладзенькіх белліцэістак будзілі ўва мне своеасаблівае нясмелае разгубленне, таксама як і пытанні адкуль у мяне інспірацыя напісаць верш „Твае вочы...". Надта ж асабістае, але вельмі файнае і цікавае пытанне. А мы ж, паэты, пішам вершы проста ад сэрца. Кожны верш не адрасаваны асаблівай хвіліне, месцу ці асобе. Лепш апрануць гэта ў нейкую нотку гумару ды прыправіць яго далікатнай какетлівасцю і ўжо дзяўчатам весялей і паяўляюцца ўсмешкі ці какетлівыя ўздыхі маладых красунь. Вядома — маладыя і ўсё іх цікавіць, асабліва тое, навошта той Буйнюк і Баена прыехалі да нас у ліцэй. Мусіць, каб урокаў не было. Затое мы з Юрыем стараемся даказаць, што можа быць цікава, бо маем новыя зборнічкі, новыя вершы і можам ахвотным раздаць кніжкі. Цікавае было пытанне адной вучаніцы пра інспірацыю да творчасці. Ну і я прыгадаў сваё дзяцінства ды захапленне беларускай літаратурай, якое я абавязаны свайму бацьку і дзядулі з боку мамы. Пані Ірэна Ігнатовіч запытала нас ці мы пішам вершы пры нагодзе юбілеяў. Мой адказ можна падсумаваць тым, што я не займаюся „цэпэліяй", бо не ўмею пісаць вершаў на загад. А той, хто пытае, відаць яму мае ці Баенавы вершы неабыякавыя. Пасля сустрэчы я падпісаў шмат зборнікаў. Ідуць, бяруць, а ці будуць чытаць? Ці сапраўды захапляюцца маёй паэзіяй? Неяк у тых электронных часах верыць у гэтае не хочацца, але хай бяруць. Як яны не пачытаюць, то можа бацькі заглянуць у кніжку. Як падпісваю, то ўсё пытаю прозвішча будучага чытача маёй кнігі. „Jeszcze nazwisk nie pamięta!" — ціха сказала з дакорам адна дзяўчына другой. Думаю, падпішу, хай будзе вядома канкрэтна каму па імені і прозвішчы. Даеш дарэмна, не хочаш грошай, бо робіш ад сэрца, а во дзякуй. Але наогул вельмі міла і вельмі сімпатычна было. Пані Ірэна Ігнатовіч з бібліятэкі вельмі сімпатычная. І пан Ян Карчэўскі, вельмі прыхільны, ну і з ноткай жарту зарэкламаваў так сказаць мой халасцяцкі стан перад натоўпам файных, мілых і прыгожых белліцэістак. Толькі я шчырым сорамам на твары, як чырвоным баршчом, сыта наеўся. Я ж не прыехаў у Гайнаўку ў сваты ці жонку выбіраць, я ж прыехаў вершы пачытаць, падпісаць зборнік, расказаць пра сябе пару слоў. Што зробіш — за самоту трэба цярпець усялякія жарты. Ну, але добра, была вельмі мілая паэтычная сустрэча. Варта нагадаць, што на сустрэчы быў таксама мой сябар-паэт, настаўнік Юрый Баена, які таксама чытаў свае вершы і падпісаў шмат сваіх зборнічкаў. Дзякуй вам дарагія гайнаўскія настаўнікі, мілыя пані з бібліятэкі і самыя прыгожыя дзяўчаты-белліцэісткі на Падляшшы. Дзякуй, што схацелі паслухаць Буйнюка. Што нядобрае было — выбачайце. Дзякуй і Гайнаўцы, што яна больш беларуская за Бельск-Падляшскі, які яшчэ ніколі не запрасіў мяне на аўтарскую сустрэчу. Жыве беларуская Гайнаўка!

Юрка БУЙНЮК

Вачыма еўрапейца

Дай, пан прэм'ер, залатоўку

Пішучы гэты тэкст у дапасхальны перыяд, аж хочацца мне сказаць: сеймавая камісія нацыянальных і этнічных меншасцей, бывае, ходзіць ад Анны да Каяфы. Так напэўна справа маецца ў выпадку яе хадайніцтваў за фінансавую дапамогу Грамадскаму камітэту, які ўжо больш за дзесяць гадоў стараецца пабудаваць пры Свята-Духаўскім саборы помнік „Праваслаўным жыхарам Беласточчыны забітым, замучаным і прапаўшым у 1939-1956 гадах". „Пачынаючы з 1998 года хадайніцтвам Таварыства пабудовы помніка перашкаджалі самаўрадавыя ўлады Беластока. Пяць разоў прэзідэнт горада Беластока выказваў свой супраціў і кожны раз чарговыя падляшскія ваяводы гэтыя рашэнні адмянялі. Цяперашні прэзідэнт горада Беластока чарговую заяву, пададзеную ў 2006 г., не апратэставаў, што дало магчымасць пачаць падрыхтоўчыя працы да пабудовы помніка", — такія словы прагучалі ў дэзідэраце камісіі накіраваным у гэты раз прэм'еру Дональду Туску.

Раней міністр культуры і нацыянальнай спадчыны, а папраўдзе падначалены яму генеральны сакратар Рады аховы памяці змаганняў і пакутніцтва Анджэй Пшэвозьнік магчымасцей дафінансавання пабудовы помніка па фармальных прычынах не бачыў. Дэзідэрат такога ж зместу камісія „пераправіла" тады міністру ўнутраных спраў і адміністрацыі. Яшчэ да „выхаду" дэзідэрата ў тое ведамства я сумняваўся на старонках „Нівы" ў тым, што знойдуцца таксама і тут тыя грошы на гэтую мэту, з адзінай магчымай крыніцы, значыць, з Касцельнага фонду. І аказалася, што меў я рацыю. У час пасяджэння сеймавай камісіі, пасля якога быў пададзены дэзідэрат прэм'еру (змяніўшы толькі адно слова, з „пану міністру", спачатку культуры, пасля ўнутраных спраў, якраз на „пану прэм'ер-міністру"), віцэ-міністр МУСіА Збігней Сасноўскі тлумачыў:

— Адпаведна актуальным правілам, сродкі Касцельнага фонду, які застаецца ў распараджэнні міністра, могуць быць прызначаны на адбудову, рамонт і кансервацыю выключна сакральных аб'ектаў гістарычнай каштоўнасці. Таму нельга са сродкаў Фонду фінансаваць пабудову новага аб'екта або разбудову ўжо існуючага. Закон ад 6 студзеня 2005 г. аб нацыянальных і этнічных меншасцях і аб рэгіянальнай мове, на жаль, таксама не дае нам магчымасці, каб выканаць просьбу змешчаную ў дэзідэраце. Па гэтай прычыне мне вельмі прыкра, што наш адказ з'яўляецца такім, якім я яго прадставіў, і не па маім хаценні, а па юрыдычных прычынах.

У гэтай сітуацыі падляшскі дэпутат, віцэ-старшыня камісіі Яўген Чыквін, які столькі ўклаў стараннаў у пошуках адрасата для дэзідэрата, запрапанаваў якраз адкліканне аж да прэм'ера.

— На маю думку, а выступаю ў гэты момант як заступнік урада, важным з'яўляецца тое, каб хоць праз сімвалічную залатоўку [агулам справа ў каля 40 тыс. зл. — М. Х.] даць шанц уключыцца ў ініцыятыву і завяршыць гэтую справу. Ва ўспрыманні грамадскасці Падляшша рэзкім бачыцца шматгадовае парушэнне закону самаўрадавымі ўстановамі. Цяпер наступаюць чарговыя адмовы міністраў КіНС і УСіА са спасылкай на юрыдычныя правілы, хоць пры добрай волі — што падказваю — пан прэм'ер мог бы пакарыстацца хоць бы сваім рэзервам.

Зараз пасля яшчэ дадаў:

— Пан прэм'ер мог бы перадаць нейкую суму на гэтую мэту. Застанемся пры той залатоўцы.

Што, па-мойму, зробіць прэм'ер? Цяжка прадбачыць. Можа падзейнічае, прыгадваючы сабе пагаворку наконт кульгавай у Польшчы юрыдычнай сістэмы: знайдзі злачынцу, а і параграф знойдзецца?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

У службе Богу і людзям

Размова з мітраформым протаіерэем, доктарам тэалагічных навук у галіне гісторыі Царквы, айцом Рыгорам САСНОЙ, публіцыстам і даследчыкам мінулага Праваслаўнай царквы ў Польшчы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— Неўзабаве пасля Вялікадня, бо 30 красавіка, будзеце святкаваць 70-годдзе з дня нараджэння. Вы ўспаміналі раней пра цяжкое дзяцінства, гаварылі, што Вашым лёсам у нейкі спосаб пакіраваў дырэктар Бельскага белліцэя Яраслаў Кастыцэвіч, калі параіў Вам паступіць у духоўную семінарыю. Трэба было зрабіць выбар, які ў тадышняй атэізаванай Польшчы патрабаваў вялікай адвагі і ахвярнасці.

— Пасля вайны мы не мелі дзе вучыцца і бацькі наймалі нам настаўніка, які вучыў па хатах. І такім чынам я ў 1945-1946 гадах здабываў адукацыю. Пасля я 2 гады вучыўся ў польскай школе ў Малінніках, а пазней — па 7 клас у Орлі. Я меў ахвоту вучыцца далей і паслалі мяне ў беларускі ліцэй, які называлі ў нас сваёй школай. Яраслаў Васільевіч Кастыцэвіч ведаў вясковае жыццё і рэчаіснасць, у якой апынулася Праваслаўная царква ў Польшчы. Калі ён запрапанаваў мне ісці вучыцца ў духоўную семінарыю, у мяне былі сумненні, ці я спраўлюся з багаслоўскімі прадметамі і спевам, бо я толькі адзін год вучыўся Божага закону пры сваёй прыхадской царкве. Аднак Яраслаў Васільевіч напісаў у семінарыю некалькі слоў аба мне і паколькі ў мяне былі здадзены ўжо матуральныя экзамены, мяне туды прынялі. Калі семінарысты на вячэрніх курсах здабывалі сярэднюю адукацыю, я ўжо вучыўся толькі багаслоўскім прадметам і за тры гады закончыў чатырохгадовую семінарыю. Мы ўжо тады не спалі на саломе, як першыя семінарысты, але на матрацах, а і жыллёвыя ўмовы былі не найгоршымі. Аднак адчувалася, што спецслужбы сачылі за намі. Дырэктар семінарыі, напрыклад, ведаў, што ў вольны час рабілі семінарысты, якія выязджалі на вячэрнія заняткі ў сярэдняй школе.

— Пасля семінарыі Вы паступілі ў Тэалагічную акадэмію і хутка трапілі на прыход.

— Тады якраз засноўвалася Тэалагічная акадэмія і я паступіў у яе. Аднак пасля паспяховага заканчэння першага курса я ажаніўся з матушкай Антанінай Троц і калі стаў святаром, мяне выслалі служыць на прыходзе. Спачатку накіравалі мяне ажно пад Пярэмышль, у Кальнікаў, дзе я сутыкнуўся з украінскім асяроддзем. Перада мной святаром служыў там украінец, які разгарнуў дзейнасць у нацыянальным напрамку, што не падабалася тагачасным уладам. Я, як беларус, меў гарантаваць палітычную стабілізацыю. Аднак я напісаў прашэнне, каб мяне перавялі бліжэй Варшавы, каб я мог працягваць вучобу ў Тэалагічнай акадэміі. Перавялі мяне ў Кодзень, адкуль было зручна даязджаць у Варшаву, прыблізна 200 кіламетраў. У Кодзені не было нават прыхадскога дома, але з Божым блаславенствам хутка ўдалося купіць парафіяльны дом, гаспадар якога згадзіўся адтэрмінаваць заплату. Я быў тады пад уражаннем вялікай духоўнасці жменькі прыхаджан, якія перажылі пасляваенную завіруху і акцыю „Вісла". Мяне аднак цягнула да сваіх людзей, на Беласточчыну і нас перавялі ў Сямятычы, дзе я праслужыў ажно 25 гадоў, спачатку як памочнік настаяцеля, а пасля як вікарны свяшчэннік. Мяне вельмі цешыла, што ў тадышні час праз сямятыцкую бібліятэку я мог заказваць дадому нават кніжныя рарытэты з розных бібліятэк Польшчы і ў хаце мог займацца навуковай і публіцыстычнай працай.

— За амаль пяцьдзесят гадоў святарства Вы служылі Богу і людзям у розных прыходах, але маладое пакаленне памятае ўжо Вас толькі як святара Рыбалаўскага прыхода.

— У Рыбалы мяне назначылі ў 1987 годзе. Адсюль зручны даезд як у Беласток, так і ў Бельск, дзе жывуць мае дзеці. Адсюль таксама больш зручны доступ да архіваў і бібліятэк, хаця ў даследчых мэтах прыходзілася ездзіць у архівы і бібліятэкі Вільні, Масквы ці Санкт-Пецярбурга.

— Час Вашага служэння ў Рыбалах гэта час вялікай міграцыі беларускай моладзі з вёсак у гарады.

— З нашага Рыбалаўскага прыхода выехала ў гарады таксама вельмі многа маладых людзей. За час, калі тут служу, правёў я на могілкі пад 500 асоб, а за гэты час нарадзілася каля 50 дзетак. У многіх дамах жывуць ужо дзед і баба, старэйшыя адзінокія людзі, або дамы пустуюць. Добра, што выхадцы з нашых сёл не прадаюць родных хат, толькі трымаюць іх для летняга адапчынку. Зараз у прыходзе можа пад 15 дзетак у школьным узросце. Я гавару, каб бацькі адразу вучылі дзяцей гаварыць на дзвюх мовах — на сваёй і на польскай, але наймалодшыя ўжо ў асноўным польскамоўныя.

— У асяроддзі праваслаўных беларусаў Вы вядомы як даследчык мінулага Праваслаўнай царквы ў Польшчы і жыцця звычайных людзей на Беласточчыне. Ці маглі б Вы сказаць як нараджалася прага да навуковай дзейнасці?

— Гэта пачалося з любові да сваіх людзей і прагі знаёмства з гісторыяй. Калі я быў малым хлопцам, слухаў расказы старых людзей і думаў чаму калісь было так, а не інакш. У школе я цікавіўся гісторыяй. Калі ў Залешанах, непадалёк маёй роднай вёскі Шарні, пасля вайны здарылася трагедыя, нам таксама прыходзілася начаваць у кустах. Шукаў я адказаў на розныя пытанні і хацеў спазнаць роднае. Будучы святаром, пачаў цікавіцца гісторыяй Царквы і, пачынаючы з Беласточчыны, пашырыў свае зацікаўленні на Польшчу і ўсходняе хрысціянства.

— У даследчыцкай дзейнасці Вам дапамагае матушка Антаніна, саўтарка часткі Вашых кніжак.

— Няцяжка было заахвоціць матушку збіраць матэрыялы пра нашу зямлю. Калі матушка перайшла на пенсію, асабліва стала дапамагаць мне збіраць інфармацыі з гістарычных крыніц.

— Аўтабіяграфічная, у нейкім сэнсе, кніжка пра Рудуты і Шарні, пра жыццё Вашых і матушкі продкаў і сваякоў паказвае як мяняліся лёсы і жыццё беларусаў.

— Добра, што ў гэтай кніжцы ўдалося падвесці вынікі нашай ранейшай працы, апублікаваць сабраныя матэрыялы і адначасна паказаць жыццё нашых людзей. Я рады, што ўдалося так далёка дайсці назад з генеалагічным дрэвам і давесці, што мой продак Марк і матушкі Дзмітры — гэта родныя браты. Пры гэтым аказалася, што матушка ў сёмым пакаленні ад іх з'яўляецца мне цёцяй.

— У мінулым годзе Вы атрымалі II узнагароду і медаль імя Зыгмунта Глогера за даследаванне гісторыі праваслаўя на Беласточчыне. Як Вы ўспрынялі ўзнагароду, бо ведаю, што вельмі ўзрушыліся ў дзень уручэння яе, калі ўбачылі ў Ломжы выстаўку сваіх кніжак?

— Гэтая ўзнагарода не прысвойваецца выпадкова і таму яна мяне асабліва радуе. Я ведаю, што капітул узнагароды прасветліў маю даследчыцкую работу, а выстаўка маіх кніжак у Ломжы паказала плён маёй працы, заўважаны капітулам.

— Узнагарода Глогера — толькі адна з многіх Вашых узнагарод.

— Раней я атрымаў сярэбраную і залатую адзнакі „Заслужаны Беласточчыне", Сярэбраны крыж заслугі, Крыж кавалерскі Ордэна Адраджэння Польшчы, узнагароду імя брата Альберта. Калі гаварыць пра царкоўныя ўзнагароды, дык тры разы атрымаў я Ордэн св. Марыі Магдаліны II ступені (I ступені атрымліваюць архірэі), Ордэн св. Марыі Магдаліны II ступені з аздабленнямі і Мітрапаліцкі крыж.

— Пасля Вялікадня аб'яднанне „Музей малой айчыны ў Студзіводах" будзе выдаваць ужо чарговую кніжку аўтарства Вашага і матушкі Антаніны — „Кнігазбор".

— Замешчаны ў ёй кніжкі, якія мы з матушкай сабралі ў сваёй бібліятэцы. Разам згуртавана ў ёй больш за 6 тысяч экземпляраў, сярод якіх найбольш кніжак царкоўнага характару, а асабліва па гісторыі Царквы. Ёсць таксама многа кніжак аб мінулым Беласточчыны і нашай гісторыі. Паколькі зацікаўленні нашых дзяцей іншыя, чым мае і матушкі, наша бібліятэка была б клопатам для нашчадкаў і мы рашыліся пакінуць сабе толькі частку кніжак, а іншыя перадаць у тыя месцы, дзе яны найбольш патрэбныя. Будзем перадаваць іх у Музей малой айчыны ў Студзіводах, Бельскі белліцэй, Бібліятэку Варшаўскай праваслаўнай мітраполіі, Супрасльскі мужчынскі манастыр, Жаночы манастыр на Гары Грабарцы, Цэнтр праваслаўнай культуры ў Беластоку, на Кафедру тэалогіі Універсітэта ў Беластоку, Прыхадскую бібліятэку Свята-Мікалаеўскага сабора ў Беластоку і Бібліятэку Люблінска-Холмскай епархіі.

— У Вас многа матэрыялаў да чарговых кніжак. Ведаю, што зараз рыхтуецца таксама да выдання манаграфіі Ласінскага прыхода.

— Недзе ў палове года можа выйсці манаграфія гэтага прыхода, якую мы рыхтуем з матушкай Антанінай. Якраз мы рашыліся даследаваць гэты прыход, бо захавалася вельмі многа матэрыялаў. Калі людзі з Ласінскай парафіі выязджалі ў бежанства, усе метрычныя запісы і іншыя прыхадскія дакументы сабралі ў вялікую скрыню і зацягнулі яе на званіцу. Ніхто пазней туды не заглядаў. Дакументы захаваліся ў добрым стане. Калі пасля быў указ здаваць старэйшыя метрычныя дакументы свецкім уладам, духавенства гэтага прыхода яго не выканала і такім чынам па сённяшні дзень захаваліся даўнія метрыкі і дакументы.

— Апошнім часам выдаўцом Вашых кніжак з'яўляецца студзіводскае аб'яднанне. Сааўтарам некаторых Вашых кніжак з'яўляецца Дарафей Фіёнік, старшыня гэтага аб'яднання.

— Кажуць, што рыбак рыбака знойдзе. Я заўважыў зацікаўленні Дарафея, калі ён публікаваў свае матэрыялы ў „Ніве" і з гэтага пачалося наша супрацоўніцтва. Мы супольна з Дарафеем выдалі кніжкі аб прыходах у Орлі, Рыбалах, Пасынках, Шчытах і Бельску.

— Вялікдзень — асаблівае свята ў жыцці хрысціян. Чаго б Вы пажадалі з гэтай нагоды чытачам Вашых кніжак?

— Я хацеў бы, каб нашы людзі як найбольш ведалі аб праваслаўі і аб гісторыі нашай Беласточчыны. Жадаю, каб было Божае блаславенства на працу людзей, якія займаюцца даследаваннем мінулага, каб пасхальная радасць была ўва ўсіх нашых дамах і мы ў сямейных абставінах радасна правялі святы.

— Дзякую за размову. Віншуем Вас з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння і ад імя рэдакцыйнага калектыву жадаем Вам здзяйснення мараў у духоўным і навуковым жыцці.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Моўныя інавацыі і эмоцыі!

Новыя беларускія словы, тыпу: *дасследнік* ці *ўлётка* правакуюць каментарыі і спрэчкі. Гэтая праблема не датычыць адно сталіцы Беларусі, дзе ўзнікае большасць моўных інавацый. Шмат эмацыйных спрэчак на гэтым грунце прапануе наша Радыё „Рацыя". Цікава, што ў Беластоку найбольш крытыкуюць запазычанні з польскай мовы... Тым самым наш абаронца беларускай „чысціні" — фізічна будучы „заходнікам" — паводзіць сябе як класічны „ўсходнік".

З дакладам „Інавацыі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове" выступіў прафесар Сяргей Запрудскі, сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Сустрэча адбылася ў рамках беларускіх чацвяргоў 26 сакавіка г.г.

Апошні ўраджай інавацый назіраецца напрыканцы 80-х і пачатку 90-х гадоў XX ст., калі ў Беларусі з'явіліся палітычныя змены. З'яве ад пачатку спадарожнічала эмацыйнае ўспрыманне. Найчасцей, падзел ішоў па палітычнай лініі. Каб паказаць як справы выглядаюць на практыцы, прафесар Запрудскі сярод членаў БНФ і партыі камуністаў правёў апытанне. Вось прыкладова слова *ўлётка* падтрымала 82 працэнты членаў БНФ, а іх палітычны сапернік не даў ні аднаго голаса падтрымкі. Падобна справа маецца са словам *выступовец*, якое ў ста працэнтах падтрымала БНФ і поўнасцю адкінулі камуністы.

Палітычнае ўспрыманне інавацый можа пашкодзіць у вяртанні старабеларускіх слоў такіх як *гарбата* ці *выстава*. Прытым палітычны падзел паміж згаданымі партыямі ценем сцелецца на геаграфічны падзел між „заходнікамі" і „ўсходнікамі". Каб трапіць у рады „ўсходнікаў", дастаткова замест слова *гарбата* ўжываць слова *чай*, *выставу* назваць *выстаўкай*.

Пра месца інавацый у слоўніку вырашаюць мовазнаўцы-кадыфікатары. Кадыфікацыйныя намаганні маюць вялікае значэнне. Для мовы важнай справай з'яўлецца патрэба стабільнасці, вялікі прыток новых слоў можа расхістаць мову і дэзарыентаваць значную колькасць людзей. Тым больш у сітуацыі Беларусі, дзе значная колькасць людзей валодае мовай пасіўна. Інавацыі — жывы працэс, яго нельга ўспрымаць адназначна. У канцы прафесар канстатаваў:

— Важныя рэальныя навыкі жывой камунікацыі, не гаварыць людзям як яны павінны гаварыць. Важна, каб гаварылі на мове.

Даклад прафесара Сяргея Запрудскага выклікаў цікавую спрэчку і рэфлексіі.

Фота і тэкст
ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У паноў Сатараў

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

У 12-м нумары „Нівы" Таіса Скуратава згадала пра памешчыка Сатара, які меў свой маёнтак на ўсходніх акраінах Белавежскай пушчы. І неўзабаве пасля выхаду газеты пазваніў мне спадар Уладзімір Клімюк з Плянты, якому ўспамін пра Сатара не быў абыякавым...

Мой дзед, Філіп Засім з Семяноўкі, пачаў свой расказ спадар Клімюк, ажаніць, што мужык мог зрабіць з тою каровай — ці, напрыклад, мог зарэзаць або прадаць цяля ад яе. Сваім парабкам дазваляў пан таксама трымаць курэй і свіней на мяса. Жылі рабочыя ў двухсямейных хатах, у печах палілі дровамі з панскага лесу.

У Сатаравым маёнтку выраблялі малочныя цукеркі, якія называлі кароўкамі; былі яны вельмі якасныя і смачныя. І не мог пан забяспечыць усяго попыту на свае цукеркі.

а зімою прыязджаў шыткамі і парай гнедых коней з шалестунамі. Фурман, што вазіў пана, даглядаў толькі пару ці чацвёрку коней...

Калісь тата, які гандляваў гумай на пасталы, забраў мяне ў Папялёва, было мне тады мо з дзесяць гадоў. Начавалі мы там адну ноч. Зацікавіў мяне табун з, бадай, шаснаццаці коней і статак кароў. Запамятаўся мне і смак цукеркаў, якімі мяне там пачаставалі...

Фота з сямейнага архіва Анны КРАСНОЎСКАЙ

Пяты клас Пачатковай школы ў Нараўцы ў 1935 годзе. Злева направа: ляжаць Цімчэнка з Гушчэвіны, Гольдштэйн з Нараўкі і НН — леснікоў сын з Нараўкі; сядзяць у ніжнім радку Тадзік Грушчынскі з Нараўкі, Ніна Валкавыцкая з Заблоччыны, Вера Трусевіч з Гарадзіска, Юзэфа Карпюк з Барначчыны, Анна Крышань (пазней Красноўская) з Нараўкі, далей павінна быць Галена Куц з Нараўкі, але яна выдзерла свой твар са здымка, Ванда Стульгіс з Нараўкі, Надзея Карпюк з Барначчыны, Юрка Гарустовіч (бацюшкаў сын) з Нараўкі і Уладзімір Гарустовіч з Барначчыны; у наступным радзе сядзяць настаўніца Яніна Дадэй, ксёндз Калінскі, Чэся Жмійка з Грушак, Ніна Харкевіч з Міхнаўкі, Рамуальда Будніцкая з Нараўкі, Яўгенія Лапінская з Плянты, настаўніца Зофія Віткоўская, загадчык школы Уладзімір Антыпаровіч, Ціна Сатар з Папялёва, Тося Салавей з Нараўкі, Зіна Трусевіч з Гарадзіска і Крыся Валентыновіч з Нараўкі; у наступным радзе Оля Скепка з Грушак, Ян Ясапенька (сын балахоўца) з Нараўкі, Уладзімір Клімюк з Плянты, Рысек Кізяркевіч з Грушак, Насута з Гушчэвіны, НН, Рысек Пуззэвіч з-за Ляўкова, НН, Давід Зінгер з Нараўкі, НН, Павел Дамброўскі з Янова, бацюшка Раман Гарустовіч (родам з Лясной) і Дора Зінгер з Нараўкі; стаяць у наступным радзе настаўнік Дадэй, Насута з Гушчэвіны, НН, Мікола Навасад з Гарадзіска, 5 х НН, Давід Зінгер з Нараўкі, НН і Владак Немялтоўскі з Нараўкі; у апошнім радзе Сачко з Гушчэвіны, Юзік Клімюк (брат Уладзіміра) з Плянты, НН, Пуззэвіч з-за Ляўкова, НН, Аляксандр Бяглюк з Беглюкоў, 2 х НН і Рыгор Анішчук з Плянты.

ніўся з Марыяй Баброўскай, таксама з Семяноўкі. Зямлі ў іх было мала і дзед даведаўся, што Сатар, які мае маёнтак у Папялёве, патрабуе рабочых... Маладая сям'я падалася ў Папялёва.

Спачатку дзед быў звычайным рабочым, а пасля атрымаў пасаду гаёвага ў прыватным Сатаравым лесе. Гэтая работа патрабавала шмат кемлівасці, бо трэба было быць у ладах і з памешчыкамі, і з навакольнымі мужыкамі, што той лес падкрадалі.

У Папялёве ў дзеда і бабы нарадзілася чацвёра дзяцей: Ганна, Анастасія, Сямён і Канстанцін. Анастасія, мая мама, расказвала была мне, што так пан, як і пані адносіліся да службы добра. Калі каму захварэла дзіця, тады пан даваў яму фурмана і падводу каб завезці да лекара ў Шарашова.

Кожнай сям'і пан даваў участак зямлі, на якой можна было садзіць сабе бульбу і агародніну. Участак той рабочыя абраблялі панскімі коньмі. Кожнай сям'і пан даваў таксама карову, каб дзеці мелі малако. Карова хадзіла ў панскім статку і кармілася зімою разам з панскімі. Калі карова была цельная і не давала малака, а ў сям'і былі дзеці, тады пан загадваў даваць той сям'і малако ад сваіх кароў. Немагчыма цяпер прыпомніць, што мужык мог зрабіць з тою каровай — ці, напрыклад, мог зарэзаць або прадаць цяля ад яе. Сваім парабкам дазваляў пан таксама трымаць курэй і свіней на мяса. Жылі рабочыя ў двухсямейных хатах, у печах палілі дровамі з панскага лесу.

Калі дзед зарабіў у пана Сатара грошы, то купіў сабе зямлю на Кругліку ў Тарнопалі ад пана са Старога Двара і там пабудаваўся.

Адзін дзедаў сын Сямён загінуў на фронце ў 1914 годзе, на акопах. Другі дзедаў сын Косця ажаніўся ў 1920-х гадах і дзедавым следам таксама пайшоў з жонкай служыць да Сатара ў Папялёва; там нарадзілася іхняя дачка Марыся. Дзядзька ў Сатара трачаваў усё лета, а дзядзіна Параскева даіла панскіх кароў. Яна неаднойчы гаварыла з паняй; пані вельмі добра адносілася да служанак.

Калі дзядзька Косця зарабіў у Папялёве крыху грошай, вярнуўся ён да дзела ў Круглік і паставіў сабе там хату. А былі ў яго залатыя рукі і шмат зарабляў цясляркай і сталяркай.

Калі я прачытаў у „Ніве" пра Сатараў, прыгадаў я Ціну Сатар, якая ў мой час вучылася ў школе ў Нараўцы; жыла яна тут на кватэры ў сваіх сваякоў. Мабыць таму і вучылася яна ў Нараўцы, а не ў бліжэйшым да Папялёва Шарашове. У Ціны была радня: быў брат Аляксандр і яшчэ брат, здаецца Ізраіль. Помню, як пан Сатар, заязджаючы па Ціну, прыязджаў паруконнай брычкай на чыгуначную станцыю Нараўка па сваіх пасажыраў, а зімою прыязджаў шыткамі і парай гнедых коней з шалестунамі. Фурман, што вазіў пана, даглядаў толькі пару ці чацвёрку коней...

Калісь тата, які гандляваў гумай на пасталы, забраў мяне ў Папялёва, было мне тады мо з дзесяць гадоў. Начавалі мы там адну ноч. Зацікавіў мяне табун з, бадай, шаснаццаці коней і статак кароў. Запамятаўся мне і смак цукеркаў, якімі мяне там пачаставалі...

Столькі мне пра Сатара расказаў спадар Клімюк. Але гэта не ўсё; па больш інфармацыі накіраваў ён мяне да спадарыні Анны Красноўскай з Нараўкі, якая захавала школьны здымак з Цінай Сатар.

Падаўся я ў Нараўку. Спадарыні Анне Красноўскай ужо восемдзесят пяць, але яна многіх аднакласнікаў са здымка з 1935 года не забыла, а дзяўчат помніць усіх. Ціна Сатар вучылася ў Нараўцы толькі адзін год, жыла яна ў сваякоў амаль насупраць школы (цяпер у будынку той школы Галерэя імя Тамары Саланевіч), была яна вельмі прыгожай дзяўчынай. А які быў яе ранейшы і далейшы лёс — невядома...

Да гэтага ўсяго дадам, што невядомы і лёс ейнай сям'і. Сатары былі яўрэямі, таму можна меркаваць, што калі ім удалося пазбегнуць гітлераўскай расавай чысткі, то яшчэ трэба было, як памешчыкам, ратавацца перад савецкай класавай... І, на канец, адна заўвага да тэксту Таісы Скуратавай: тым панам, які быў забіты „класавымі мсціўцамі", мабыць быў брат Ціны Аляксандр, які быў любіў пазабаўляцца. І цалкам магчыма, што не з-за грошай закончыў ён сваё зямное бытаванне едучы з каханкай — траянская вайна ўспыхнула ж з-за жанчыны...

Меткі Хрушчоў і ненасытны Брэжнеў

Мікіта Хрушчоў і Уладыслаў Гамулка падчас супольнага палявання ў Белавежскай пушчы (Magazyn Gazety Wyborczej, Nr 29/1995)

Пётр БАЙКО

У савецкай прэсе пра паляванні генеральных сакратароў ЦК КППС у беларускай частцы Белавежскай пушчы звычайна наогул не пісалася. Доўгімі гадамі гэта была тэма табу. Маўчанне мінскіх і маскоўскіх газет спыніла толькі перастройка. Пасыпаліся тады артыкулы, выяўляючыя тайны знаходжання савецкіх чыноў у гэтым закавулку свету. Журналісты найчасцей абапіраліся на ўспаміны людзей непасрэдна звязаных з падрыхтоўкай і вядзеннем паляванняў. Такім чалавекам быў між іншым Віктар Вакула, які гэтымі справамі займаўся ў 1985-1986 гадах.

Аднойчы Віктар Антонавіч так расказваў карэспандэнту „Камсамольскай праўды": „Віскулі мы пачалі будаваць напрыканцы 1957 года (у сапраўднасці, у ліпені таго ж года — П. Б.), спецыяльна на першы візіт Мікіты Хрушчова. Паспелі мы толькі з галоўным, двухпавярховым корпусам (дарэчы, у тым, у якім у 1991 годзе нарадзілася Садружнасць незалежных дзяржаў — П. Б.). Напярэдадні прыезду першага сакратара ўсю ноч, пры дапамозе лямпаў, асушвалі мы свежа абтынкаваныя сцены, але і так не ўдалося цалкам устараніць сырасць. Мікіта Сяргеевіч прыехаў 5 студзеня 1958 года. У палацыку пераначаваў толькі першую ноч, апошнія (знаходзіўся цэлы тыдзень) правёў у сваім „прэзідэнцкім" цягніку. Паляванні наладжвалі з загоншчыкамі. Ішло іх 20-30 чалавек, прычым кожны другі загоншчык — гэта камітэтчык".

Пра візіты Хрушчова Вакула даведваўся два дні да яго прыезду. Мікіта Сяргеевіч прыязджаў штогоду, на пачатку студзеня, пераважна на тыдзень (у 1962 годзе паляваў супольна з Уладыславам Гамулкам; згарэў тады Паляўнічы дом у Белавежы). У той час усе ўязныя дарогі ў пушчу былі перакрыты міліцыяй і бяспекай. Уезд пабочным не дазваляўся. Дарогі ўнутры пушчы, якія даводзілі на месца палявання, перакрывалі ў сваю чаргу мясцовыя егеры і леснікі.

„Называлі мы іх, — гаварыў Віктар Вакула з усмешкай на вуснах — „актывістамі". Падчас першага знаходжання Хрушчова я асабіста дакладваў палкоўніку Сталярову — начальніку яго аховы пра гатоўнасць распачаць паляванне. Сталяроў быў вельмі падобны на Мікіту Сяргеевіча, толькі што крыху накульгваў. Перадаваў ён рапарт Хрушчову і тады наш госць, апрануты ў барсавае футра, паяўляўся ў галоўных дзвярах палацыка. Пад'язджалі два цяжкія браніраваныя „ЗІСы". Заўсёды садзіліся мы ў зялёны. Наперадзе, побач шафёра, садзіўся Сталяроў, ззаду жа Хрушчоў, яго ахоўнік і я. За намі пасоўваўся „ЗІС" з „аўтаматчыкамі".

Па-за сваімі правадырамі, В. Вакула на паляваннях спадарожнічаў усім кіраўнікам сацыялістычных дзяржаў, а таксама касманаўтам — Пятру Клімуку і Міраславу Гермашэўскаму. Як сцвярджаў, ніхто лепш за Хрушчова не страляў.

„Аднойчы, — апавядаў кіраўнік белавежскіх паляванняў, — Хрушчову спадарожнічаў яго зяць Аляксей Аджубей. Стаянкі паляўнічыя былі па-суседску. Калі паявіліся дзікі, я пачуў тры выстралы запар. Водгалас трохстволкі Хрушчова, якую атрымаў у падарунку ад чэхаў, цяжка было б пераблытаць з якой-небудзь другой стрэльбай. Потым выстраліў Аджубей. Два дзікі ўпалі адразу, трэці — паранены — паімчаўся ў гушчар. Аджубей даказваў, што параненую штуку ён трапіў сам. Уваходзіць у спрэчку з гэтак высокімі паляўнічымі, вядома, ніхто з нас не асмяляўся. На канец мы знайшлі падстрэлка. Выявілася, што рана знаходзілася на правым баку, значыць, з напрамку ад Хрушчова. Трапленне трыма снарадамі трох дзікоў за адным выстралам, без спецыяльнага прыцэльвання, асталося назаўсёды рэкордам пушчы.

Пад канец свайго кіравання Мікіта Хрушчоў не меў ужо такога вока.

Прыехаў аднойчы, загоншчыкі спраўляліся паспяхова, а ён тры дні даваў маху. На канец раззлаваўся, запальчыва плюнуў і ад'ехаў.

Калі Хрушчова адхілілі ад улады, паляваннямі ў пушчы зацікавіўся Леанід Брэжнеў. У палацыку ў Віскулях паявіўся ўжо праз тры месяцы пасля сваёй „каранацыі".

„Прыехаў да нас, — успамінаў В. Вакула, — без спецыяльнай аховы і ўрадавых „ЗІСаў". Мы здзівіліся. Даволі позняя пара дня не стрымала паляўнічага запалу генсека. Рад не рад мы былі вымушаны сабрацца на начное паляванне. Запамяталася яно мне на ўсё жыццё.

У аўтамашыне сядзела нас чатырох. Я, шафёр Мікалай Шчэрбакоў, Брэжнеў і яго ахоўнік. Леанід Ільіч апрануўся ў зялёны генеральскі кафтан з падкладкай з футра. Едучы, вылоўлівалі мы бакавым рэфлектарам дзічыну. Брэжнеў толькі націскаў курок. Застрэліў аленя і некалькі дзікоў. Забралі мы іх з сабой. Аўтамашына аж стагнала, а Леаніду Ільічу ўсё было мала. Курачы „Явы", безупынна выглядаў здабычы. Наогул я спалохаўся. Я сам выкурваў дзве пачкі ўдзень, а ён прыкурваў папяросу ад папяросы. На канец, справіўшыся са сваім цэлым запасам, звярнуўся да мяне: „Ты маеш яшчэ што-колеч?" Адказаў я яму: „Маю, але вы ж, таварыш сакратар, не будзеце курыць маіх" (я курыў звычайныя, беларускія). Тады ён: „А чаму не буду? Буду і то яшчэ як! Ты не саромейся, я яшчэ не звыкся быць начальнікам".

Набліжалася світанне. Я ўжо ведаў, што ў Віскулях пачалася паніка, а мы нават радыёстанцыі з сабой не мелі. У нейкі момант ізноў угледзелі дзіка. Велічэзнага! Не выпускалі мы яго з рэфлектара. Наш госць выстраліў некалькі разоў. Дзік, хаця траплены, рухаўся надалей. Брэжнеў павярнуўся да капітана: „Ёсць яшчэ патроны?" На жаль, як амуніцыя, так і папяросы ўжо вычарпаліся. Тым часам ашалелы ад болю дзік накіраваўся ў наш бок. Я ружжа з сабой не меў, зрэшты, на такія паляванні ніхто з нас яго не браў. Крыкнуў я тады да капітана: „Дай яму пісталет! Хай цэліць дзічыне проста ў галаву". І сапраўды, Леанід Ільіч упакаваў яму ўсю магазінную каробку.

Вярнуліся раніцай. Цэлая світа стаяла на вуліцы з узрадаванымі тварамі. Нарэшце знайшлася Дарагая Згуба!"

На вясковым сходзе

27 сакавіка ў Кузаве адбыўся вясковы сход. Сустрэча з прадстаўнікамі гміннай адміністрацыі пачалася ў 17 гадзін у мясцовай святліцы. Хоць абвесткі былі развешаны намнога раней, на сход прыйшло... чатырнаццаць чалавек (так мізэрнай прысутнасці ў кузаўсім салэцтве раней не прыкмячалася).

Згодна з парадкам дня, які зачытаў солтыс Раман Бішчук, войт пазнаёміў прысутных з сёлетнім бюджэтам. Да важнейшых інвестыцый у вёсцы можна залічыць рамонт святліцы. На гэтую мэту гміна прызначыла больш за паўмілёна злотых. У ходзе дыскусіі (таксама мізэрнай па прычыне малалікасці ўдзельнікаў) краналася праблема рамонту гравейкі на могільнік, пабудовы водаадліва на скрыжаванні дарог Рэпчычы — могільнік, добраўпарадкавання пляцоўкі побач крамы, водасцёкавай каналізацыі і неакуратных паслуг Гайнаўскага прадпрыемства камунальных паслуг пры вывазцы нечыстотаў. Жыхары скардзіліся, што прадпрыемства забірае няпоўныя сметніцы, а прысылае рахункі паводле поўных квартальных ставак, хоць паводле дамовы павінны забіраць адно загружаныя сметніцы.

— Перад вясковай крамай раструшчаны пад'езд, — канстатавала Вольга Саўчук. — Гэта непрыемнае відовішча для кліентаў і прыхаджан, якія падаюцца на багаслужбу (крама мяжуе з царквой). Прадпрымальнік павінен выкласці пад'езд пліткамі, зрабіць прынамсі агароджу навокал будынка. Зараз аўтамабілі загразаюць у балоцістай твані.

Чарговы ўдзельнік дыскусіі крануў праблему тэрміну выканання водасцёкавай каналізацыі. На пытанні адказваў войт Міхал Врублеўскі. Дарогу на могільнік і водаадліў гміна можа выканаць у рамках сваіх магчымасцей і сціплых сродкаў, але абкапаць гравейку на могільнік спатрэбіцца тэхніка, а гміна на гэта не мае грошай. Сёлета будзе мадэрнізавана вузкакалейка. Пабудова санітарнага калектара ад Ставішчаў па Кузаву будзе рэалізавацца пасля атрымання еўрасаюзных сродкаў. Справу вывазкі нечыстотаў войт абяцаў высветліць у гайнаўскіх камунальнікаў.

(УС)

Пашыраць дзейсны круг журналістаў

— Не знайшоўся ніхто ахвотны на маё месца, — заявіў Юрка Хмялеўскі, галоўны рэдактар „Часопіса", — таму я застаюся. Раней аб'явіў ён аб пераходзе на пасаду дырэктара Дома культуры ў Гарадку.

З'езд Асацыяцыі беларускіх журналістаў, арганізацыі, якая ў асноўным займаецца выдаваннем „Часопіса", выбраў новага старшыню і абраў новыя ўлады (19.03.2009 — Беласток). Старшынёй асацыяцыі стаў Аляксандр Максімюк. Ва ўправу ўвайшлі Ілона Карпюк (намеснік старшыні), Юры Хмялеўскі (сакратар), Ганна Кандрацюк (скарбнік) і Яраслаў Іванюк (член).

У Рэвізійнай камісіі: Веслаў Харужы, Юры Сульжык і Мікола Ваўранюк. З'езд выбраў таксама Галоўны журналісцкі суд у саставе: Міраслава Лукша, Славамір Іванюк, Хрыстафор Госк.

— Мы павінны працаваць дзеля павышэння прафесійнасці і кансалідацыі асяроддзя, — прапанаваў Юрка Хмялеўскі, — арганізаваць журналісцкія курсы і супольныя мерапрыемствы з іншымі агранізацыямі і ўстановамі.

Ганна Кандрацюк выказала словы крытыкі ў бок сутнаснага характару „Часопіса", які ўсё часцей пазбягае рэальных праблем з жыцця беларусаў, прапануючы ўзамен мемуары.

— Сапраўды, наш погляд на жыццё і той, які сустракаю ў Гарадку, гэта два розныя светы, — пагадзіўся Юры Хмялеўскі.

Алег Латышонак прапанаваў прыцягнуць у асацыяцыю журналістаў з Беларусі, каб тым самым пашырыць дзейсны круг сяброў-журналістаў. Шмат увагі з'езд прысвяціў справе адхілення Агнешкі Рамашэўскай-Гузы ад пасады дырэктара Тэлеканала Белсат. У гэтай справе быў накіраваны пратэст Управе Польскага тэлебачання.

Ганна КАНДРАЦЮК
Фота Міры ЛУКШЫ

Не праспалі ў Бельску

Зіма ўжо адышла, але пакінула многа дзірак у асфальце на вуліцах горада. Вядома, людзі маюць цяпер добрыя машыны і калі трапіш на такую дзірку, дык самаход можна лёгка паламаць. Потым выдатак непатрэбны. А калі едзеш на змярканні на веласіпедзе і не заўважыш дзіркі, дык можна ўпасці і павыбіваць зубы, бывае што апошнія! Але гарадскія фірмы не праспалі. Еду я на веласіпедзе ў суботу 28 сакавіка і бачу: працаўнікі фірмы „Максбуд" у Бельску-Падляшскім ладзяць паверхню вуліц. Будуць жыхары горада і прыезджыя едзіць па Бельску бяспечна!

Жэня МАРТЫНЮК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Паказаліся на цэнтральнай сцэне!

Мне падабаецца актыўнасць нашых дзетак і моладзі. Мова пра ўдзельніцтва ў дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова". Калі падлічыць выступоўцаў усіх узроўняў — школьны, раённы, цэнтральны — іх назбіраецца некалькі соцень. У апошнія гады гэтая колькасць яшчэ пабольшала. Арганізатары, Таварыства беларускай культуры, дадаткова запрасілі дашкольнікаў з Беластока, Гарадка, Гайнаўкі... У выніку, на сцэне паказаліся амаль два пакаленні. Побач чатырохгадовых дзетак, якія часам плачам заяўляюць, што „хочуць да мамы", выступаюць кавалеры, якім ужо вус сыплецца. Калі пытаю чаму выступаюць, чую звычайна адзін адказ:

— Каб паказацца на сцэне!

Прыемна, калі такія словы кажа таленавіты дэкламатар. У наш час шмат памянялася. Больш за здольнасці важная сама прысутнасць. Масавасці, на якой так залежыць арганізатарам і настаўнікам, рэдка спадарожнічае якаснасць. У час раённага конкурсу ў Беластоку пераважалі слабенькія выступленні. Не дзіва, што ўжо пасля гадзіны атмасфера развалілася. Як у такіх умовах выступаць чарговым дэкламатарам? Асабліва, калі прыходзіцца сядзець у такім *вуллі* пяць або і больш гадзін. Праўда, многія дэкламатары з'язджаюць адразу пасля свайго выступлення. Такім чынам губляецца найважнейшае — магчымасць завязаць знаёмасць з беларускімі аўтарамі і іх творамі. Апошняя справа выглядае занядбанай. Часта нашы лаўрэаты не памятаюць нават аўтараў „сваіх" вершаў. Праўда, гэтую істотную дэталь павінны дапільнаваць настаўнікі. Варта пры нагодзе конкурсаў арганізаць аўтарскія сустрэчы з паэтамі. І не ідзе тут пра дадатковы пункт праграмы (які яшчэ больш задоўжыў бы сустрэчу!).

Дэкламатары з Орлі з настаўніцай Марыяй Тамчук

Сёлета ў Нараўцы на цэнтральным этапе, які адбыўся 8 красавіка, выступіла аж 139 дэкламатараў. Імпрэза зацягнулася за восем гадзін. У час гутаркі з настаўнікамі чуўся адзін каментарый:

— Трэба гэта змяніць!

Арганізатары могуць пакарыстацца вопытам Цэнтра праваслаўнай культуры, які ладзіць (адначасова) конкурс для ўсіх катэгорый дэкламатараў. Дзеці і моладзь выступаюць у паасобных памяшканнях і іх ацэньваюць розныя камісіі. Уся імпрэза, пры сваёй масавасці, трывае 2-3 гадзіны. Ніхто не наракае на стомленасць, адсутнасць публікі. Публіка — найважнейшая. Яна заўсёды вылавіць добрыя выступленні і пакрытыкуе слабейшых. Самі дзеці, калі параўнаюць сябе з іншымі, глянуць на сябе інакш, з дыстанцыяй, больш крытычна...

Валянціна Ласкевіч і Куба Андрацкі

Конкурс „Роднае слова" сам у сабе цэнны і яго варта працягваць. Пасля апошняга выпуску ўсе настаўнікі хвалілі арганізатараў за якасныя ўзнагароды — талоны ў кнігарню. Вось лаўрэаты ўзнагароды Гран-пры зарабілі на кніжкі аж за 200 злотых.

На заканчэнне падаем **спісак лаўрэатаў першых месцаў** (праз тыдзень згадаем пераможцаў далейшых месцаў).

Камісія ў саставе: д-р Васіль Сегень (старшыня), Яніна Плютовіч, Іаланта Грыгарук, сярод удзельнікаў цэнтральнага конкурсу „Роднае слова 2009" назначыла два Гран-пры: **Аксане Сычэўскай** з Гімназіі № 7 у Беластоку і **Якубу Андрацкаму** з Саколкі.

Першыя месцы сярод дашкольнікаў атрымалі: **Соня Сульжык** з Гарадка і **Малгажата Галёнка** з Арэшкава. У катэгорыі класаў I-III: **Магдаліна Маліш** з Орлі, **Міхась Бабік** з ПШ № 4 з Беластока і **Лукаш Філіпюк** з ПШ № 3 у Бельску-Падляшскім.

У катэгорыі класаў IV-VI: **Матэвуш Харкевіч** з Гарадка, **Юры Карачун** і **Эля Зайко** з ПШ № 4 у Беластоку, **Дар'я Маліш** з ПШ № 3 у Бельску-Падляшскім. У катэгорыі гімназія: **Пётр Герасімюк** з Арэшкава, **Сэбастыян Місюк** і **Гжэгаж Красоўскі** з Гімназіі № 3 у Бельску-Падляшскім.

Мне найбольш спадабалася выступленне Сэбастыяна Місюка, які запрэзентаваў твор Надзеі Артымовіч „Задуменне ў маёй душы..."

Фота і тэкст:
ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пётр Герасімюк

Сэбастыян Місюк

Аксана Сычэўская

Гжэгаж Красоўскі

Зося з першага „а” класа

— 26 —

Пасля першага красавіка Вольга Сваяк правяла гутарку з Янкам Рыбачуком. Яна не пайшла са скаргай да дырэктара. Настаўніца прапанавала, каб выхавацель сам прыдумаў пакаранне свайму класу. Рыбачук моўчкі выслухаў заўвагі і нараканні. І ён вырашыў адыграцца. На ўроках фізікі настаўнік загадаў рашаць задачы з трэцяга класа. Яго план у многім спрацаваў. Пасля ўрока вучні былі разбіты, яны даказвалі, што падобныя задачы рашаюць толькі ў час экзамена на атэстат сталасці. Але Рыбачук заеўся. Ён прыдумаў у пятніцу зрабіць кантрольную з цэлага года. Кожны наступны ўрок ён вырываў вучняў да дошкі, ставіў незразумелыя пытанні і ляпіў адзінкі. У пэўны момант клас даўдрала са школы. Вучні былі праз момант шчаслівыя, але яны добра ведалі, што фізіка і матэматыка — самыя важныя для іх прадметы.

— Можа неяк папросім у яго прабачэння!? — пачаў Філіп.

— Ніколі! — абурыўся Пеця. — Хай будзе як мае быць...

У аўторак усе з нецярплівасцю чакалі ўрока фізікі. Вучні вырашылі, што ўсё ж лепш ім памірыцца з выхавацелем. Існавала пагроза, што Рыбачук зноў загадае пісаць кантрольную. На перапынку Зося сустрэла сяброўку з другога класа. Яна запрасіла дзяўчыну працаваць на школьным кірмашы, на якім прадаваліся падрыхтаваныя вучнямі велікодныя карткі і каляровыя яйкі. Разам з Зосяй папрасіўся ў краму Філіп. Хлапец таксама хацеў „схавацца” ад фізікі. Сапраўды, пасля ўрока ў вучняў адняло мову. Рыбачук зноў загадаў пісаць кантрольную з касмічна цяжкімі задачамі. Тамаш дадаткова пакрыўдзіўся на Зосю.

— Чаму ты не ўзяла мяне з сабой працаваць у краме?

— Я не ведала што раблю...

— Рыбачук і так паставіў вам адсутнасць. Вас аднак можа апраўдаць настаўнік, які арганізаваў краму.

Зося хутка пабегла ў настаўніцкі пакой, каб адшукаць арганізатара велікоднага кірмашу. Але калі даведалася хто галоўны завадатар, яна не мела адвагі пераступіць парог канцылярыі.

Галоўнай арганізатаркай кірмашу была сама Вольга Сваяк.

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Міра ЛУКША

Янот з Янова

Жыў у Янове янот Яшка.
Хадзіў з партфелем ён пад пашкай,
бо ён чыноўнік у адміністрацыі.
Яшка янот заўжды мае рацыю.
Дастане з партфеля янот
свой чорны і тоўсты блакнот...
А што пазаносіў туды?
Чакаць можна толькі бяды!
Там спісаны дні і гады,
падзеі, і ўсе дзеячы...
(калі што не так, дык маўчы...),
што, дзе і хто ўсё рабіў,
ці быў хто там, ці не быў...
Яшка ўхмылку пусціць у каўнер.
Не хочаш паверыць — не вер!
Аж раптам прапаў той блакнот!
І ў жаху вялікім янот!
Хоць пушыцца ён надалей,
нама ўжо чынушы смяшней!

Музыка з кайфам

„Open air” па-беларуску

Прывітала нас ужо вясна, а музыка наогул з ёю вітаецца падчас канцэртаў на адкрытым паветры. Самы вядомы гэтак званы „Опэн эйр” пасяліўся ў польскім горадзе Гдыня, куды прыязджаюць самыя вялікія зоркі сусветнай альтэрнатыўнай музыкі, напрыклад, „Bjork” ці „The Roots”. Беларускія музыкі ўжо амаль дваццаць гадоў сустракаюцца ў Гарадку на фестывалі „Басовішча”, а ад нядаўна ў Львове на фестывалі „BeFree”. Дагэтуль не было месца ў самой Беларусі для рок-музыкі на адкрытай пляцоўцы. Праўда, ёсць „Вольнае паветра”, але гэта фестываль, на якім перш за ўсё прэзентуюцца фольк-гурты. Зараз адкрываюцца магчымасці для каманд, якім спрыялі толькі клубы.

Ужо ў 1995 годзе Алег Хаменка, лідар гурту „Палац” прыдумаў для беларускіх гуртоў вялікі фестываль на паветры, аднак час для такой задумы не быў спрыяльны, таму ідэя адтэрмінавалася. Зараз выглядае, што палітыка ў Беларусі ў дачыненні да беларускай культуры стала больш мяккай. Дзякуючы таму на фестываль пагадзілася ўжо Міністэрства культуры, а арганізатары разлічваюць і на дапамогу Міністэрства ўнутраных спраў.

Свае выступы пацвердзілі ўжо гурты „Крама” і „Нейра Дзюбель”, а напэўна будзе іх больш, бо канцэрт мае трываць каля пяці гадзін. Месца цікавае, бо як у выпадку польскага фестывалю, які праходзіць на тэрыторыі аэрадрома, так і беларускі фестываль пройдзе на пляцоўцы аэраклуба „Баравая” пад Мінскам.

Фестываль называецца **„Bela Music — 09”** і адбудзецца 23 траўня. Асноўная ідэя фестывалю — паказаць самыя важныя дасягненні ў сучаснай беларускай музыцы. Гэта таксама надзейны крок у бок стварэння першага вялікага фестывалю, які кожны год будзе прэзентаваць у Беларусі сучасную музыку. Хто ведае, можа ў будучыні стане ён асноўнай музычнай падзеяй краіны.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 16

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 12:

Фактар, мур, лаза, прысмак, лес, ял, ар, чыгунка, каханы, пас, кіт, старонка. Лак, ас, ампер, курс, кава, тры, час, слых, мега, ласун, мак, нырка, як, даклад, ты.

Узнагароды, навейшую **кніжку Віктара Шведа „Смяшылкі”**, выйгралі **Вайцех Лаўрыновіч** з Новага Корніна і **Юстына Васілюк** з Арэшкава. Віншуем!



Міхал МІНЦЭВІЧ

У царскай Орлі

(працяг з 14 н-ра)

Сцяпан Ляшэвіч і Міхал Мураўскі, сын Андрэя, у царскім войску, 1892 г.

„Пан” жыў там, дзе цагельня

— Калі недалёка пракладвалі чыгунку з Бельска ў Гайнаўку (у 1895-1896 гг. — М. М.), — расказвала Наташа Камарчук, — то жыды Вайштыны (іх сям'я, мабыць, ужо ў той час мела ў Орлі кафлярню, або прынамсі планавала яе паставіць — М. М.) памагалі пры яе будаванні. Дарога з Орлі ў Бельск у той час была поўная балота і жалезнякі заглыбляліся ў ім аж па восі. Вайштыны хацелі, каб чыгунка пралягала праз Орлю, каб было ім зручней вывозіць свае вырабы, але бадай людзі не згадзіліся. Чыгунка канчаткова пралягла тры кіламетры ад Орлі і мястэчка ёю не пакарысталася; зараз чыгунка зарастае лесам, а дзе-нідзе зняты ўжо рэйкі.

Паміж Орляй і чыгуначнай станцыяй Арлянка на ўзвышшы, якое называецца Калёніяй Антанова, пры цары жаў „пан”, яўрэй Розенблюм; ягонае прозвішча на мове ідыш абазначае кветку ружы. Быў ён сваяком арлянскіх Вайштынаў; некаторыя арляне мяркуюць, што Розенблюм не быў сваяком, толькі калегам Вайштына. Былі там вялікія будынкі (і сад), якія былі разбураны яшчэ да першай сусветнай вайны. Памятаю, што калі наша сям'я вярнулася ў 1918 гдзе з бежанства, то там, дзе дом „пана”, раслі дзве старыя ляшчыны. Былі яны высокія, і калі я на іх залазіла то бачыла ўсю панараму. Мы, дзеці, часта бралі сабе на шыю торбы і зрывалі арэхі, — гэта я помню.

Пасля, пры санацыі, на тым месцы жыла Фенька Кубаеўская з тройкай дзяцей, хлопцаў. Іхняя хата была адзінай у полі. Калі я хадзіла са станцыі Арлянка, то ў гэтай хатцы толькі белыя галоўкі выглядалі з акон. Іх маці хадзіла ў Орлю за хлебам.

Жыццё ў тым месцы ўспамінае Аляксей Кубаеўскі, адзін са згаданых хлапчукоў...

— Па ваду хадзілі мы да крынічкі каля Орлі, а зімою распускалі снег. Што і раз нехта з'яўляўся ў нас, нейкія чужыя, а ў вайну партызаны. Калі насталі немцы, нас выселілі ў былыя яўрэйскія дамы ў Орлі. Нашу хату немцы прадалі.

Да сённяшніх дзён даўняя сядзіба Розенблюмаў і Фенькі Кубаеўскай не захавалася. Мабыць, сляды фундаментаў колішняга „пана”, як яго людзі называлі, захоўвае зямля. Сам помню, калі ў 1960-х гадах наведваў я той вузкай дарогай цагельню, быў там яшчэ відочны нейкі друз, частка фундаментаў і муру з чырвонай цэглы. Пасля, мабыць, нехта выбраў адтуль рэшткі цэглы і друзу, бо людзі, будуючы дамы, для ашчаднасці цэменту ў бетонны падмурак дадавалі камяні і ўсялякі друз. І на канец цяжкая сельскагаспадарчая тэхніка заарала той участак.

На могілках у Орлі астаўся загадкавы крыж; магілы, на якой ён стаяў, ужо няма. Гэты крыж даволі высокі і масіўны, выкананы з чыгуну. Была на ім таблічка, але яна, таксама масіўная, адарвалася, бо не вытрымалі ніты. Зараз яна абапертая аб зямлю, а на ёй надпіс: „Hier ruht in Gott Paul Hermann Olbrisch, Gestorbene im 18ten Lebensjahre 1888”. Сёння ніхто ў Орлі не ведае, каму быў прысвечаны той крыж і толькі можна меркаваць, што нейкаму немцу. Я гэтай справай цікавіўся даўно і тады апытваныя мною пажылыя людзі гаварылі, што „гэта хтось, хто жыў на цагельні, мабыць нейкі сваяк Розенблюма”. Гэта магчыма, бо Орля ж была і пад прускім панаваннем. Крыж на могілках салідны і, мабыць, толькі таму мясцовыя прыхаджане не выкінулі яго, бо такі лёс сустрэў спярша старыя высокія драўляныя крыжы, а пасля намагільнікі вычасаныя з палявога каменя. Шкада, бо тыя каменныя маглі б стаяць праз вякі, бо сучасныя, з цэменту і жвіру, рассыпаюцца па гадах. Той, хто выкідае стары намагільнік, павінен задумацца, што ў будучыні нехта можа тое ж зрабіць і з ягоным. Гэтак з намі бывае, што пражыўшы нават усё жыццё не набіраем пашаны для іншага чалавека.

Быў у Орлі шпіталь

Хаця ў царскі час Орля страціла гарадскі статус (якім ганарылася амаль трыста гадоў) і яе насельніцтва многа пацярпела ў выніку бежанства ў Расію, былі аднак і станоўчыя з'явы. Менавіта тады быў у Орлі пабудаваны велічны комплекс — чатыры драўляныя будынкі і адзін мураваны з чырвонай цэглы вельмі цікавага архірэктурнага дызайну — дзе размясціўся шпіталь. Варта падкрэсліць, што ў той час шпіталя не было нават у Бельску-Падляшскім. У царскі час у Орлі былі ўзведзены таксама будынкі гміннай установы і школы.

— Як я была маладой, — успамінала Наташа Камарчук, — то ў арлянскім шпіталі рабілі мне прышчэпку ад воспы. Пры будове аднаго са шпітальных будынкаў, таго найнавейшага (пры камуне называлі яго „новай школай”), працаваў і мой бацька.

Пры цары ў школу хадзіла я толькі ў 1913 годзе, бо пазней наша сям'я выехала ў бежанства. У Расіі я вучылася чатыры гады, і ўсе на пяцёрках. Ох, як я вучылася! Добрая была ў мяне памяць... І пры цары быў у Орлі школьны абавязак.

Тут хачу коратка прадставіць успамін народжанай у 1902 годзе Анны Клін з роду Мураўскіх з Крывятыч пра навуку ў царскі час у вёсцы Мора.

— Настаўнік быў вельмі дрэнны, нервовы. Прачытала я яму зададзеную старонку, а ён задаў яшчэ другую, якой я не вывучала. То ён за тое біў мяне па галаве, усе грабеньчыкі паламаў. Я вярнулася дадому і расказала пра гэта бацькам і яны больш мяне ў школу не пусцілі. Хадзіла толькі няпоўны год і неадукаванай асталася.

У царскай арміі

— А навошта нас цар пагнаў у бежанства? — успамінала Наташа Камарчук. — Я сама па сабе перадумваю гэта, што ён выганяў адгэтуль моладзь, каб адтуль было яму каго на вайну пасылаць; ён жа паняволі нашых браў. З нашай сям'і маіх двух братоў на вайну забралі, Федзю і Ваню. І бацьку, якому сорак гадоў было, хацелі забраць. То маці вельмі плакала, хадзіла да тых вайскоўцаў што прызывалі, на калені перад імі падала.

Брат Ваня пасля вайны стаў прафесарам медыцыны. У Маскве працаваў у сямі шпіталях. А ў другую сусветную вайну яго жыды забілі, бо быў вучаны...

Паводле Наташынай пляменніцы, Веры Мураўскай, дачкі Наташынага, Федзевага і Ваневага брата Пятра, адукаваны Ваня быў чалавекам кампанейскім і калі выпіў, любіў выкінуць з сябе словы „Бей жыдоў, спасай Расію”. За гэта трапіў у турму і адтуль не вярнуўся.

Паводле Верынага брата, Андрэя Пятроўскага, было з Ванем яшчэ інакш. Іхні бацька Пятро пры санацыі ў 1931-1933 гадах служыў у артылерыйскай часці ў Брэсце, у польскім войску. І Пятро паслаў свайму брату Ваню свой здымак у польскім мундзіры. Ваня жыў у Маскве, яго жонка была з Галадоў, аднак іх сужыццё не ладзілася. Жонка з нейкай прычыны ўдала Ваню ў НКВД. Знайшлі ў яго братаў здымак і абвінавацілі ў супрацоўніцтве з польскім войскам ды саслалі ў Сібір. Калі выйшаў яму тэрмін ссылкі і вяртаўся дадому, нехта яго застрэліў...

Перад 1914 годам частку жыхароў Орлі і суседніх мясцовасцей змабілізавалі на вайну. Але на службу ў царскай арміі прызывалі многіх жыхароў нашых мясцовасцей і раней. Нядаўна ў мае рукі трапіў здымак з 1892 года, які паказвае двух царскіх жаўнераў з Орлі. Апрануты яны ў парадныя мундзіры з шаблямі; гэта Сцяпан Ляшэвіч і Міхал Мураўскі, сын Андрэя. Здымак захаваўся ў Лявона Мураўскага, Міхалавага пляменніка. На адвароце здымка Міхал напісаў пісьмо свайму брату, Лявонаваму бацьку: „Я, слава Богу, жывы і здаровы і таго і вам жадаю”. Аўтар пісьма інфармуе таксама, што яго некуды перанясуць, пакуль не ведае куды, але просіць да яго пісаць на стары адрас. І просіць таксама, каб яму паслаць некалькі рублёў каб аддаць доўг камандзіру...

У Орлі ў час нямецкай акупацыі ў перыяд першай сусветнай вайны, як успаміналі мне раней пажылыя людзі, парадку даглядала паліцыя, у якой служылі яўрэі. Яўрэі таксама займаліся зборам кантрыбуцыі немцам з мясцовага насельніцтва.

— Немцы былі за жыдамі, — падкрэслівала Наташа Камарчук, — і то яшчэ як! Калі наша сям'я вярнулася ў 1918 годзе з бежанства, то ў Орлі былі яшчэ немцы. Хаты бежанцаў у Орлі былі спалены, але хаты тых праваслаўных, што асталіся, захаваліся цэлымі. Тады пытанне: хто спаліў нашы хаты? У нашай хаце сядзелі жыды, таму яна і ўцалела, але жыды яе запаскудзілі. Брат Федзя стаў выганяць жыда, але прыйшлі немцы і не дазволілі яго выгнаць, пакуль той не пабудаваў сабе хаты. Той жыд пабудаваў, але з нашай драўніны, што мы нарыхтавалі.

* * *

У царскі час быў разбудаваны праваслаўны прыход. Пры настаяцелі Феафіле Бяляўскім у 1867-1870 гадах была ўзведзена могільнікавая царква св.св. Кірылы і Мяфодзія, а пры царкве Арханёла Міхаіла адрамантавана званіцу.

Як меркавалі калісь пажылыя жыхары, цар спадзяваўся вайны і таму ў Орлі быў пабудаваны шпіталь. Аднак аўтары кніжак пра Орлю той факт разбудовы мястэчка прамаўчалі. Да сёння захаваліся тры царскія будынкі грамадскага карыстання: колішніх гміны, школы і адзін будынак шпітальнага комплексу. Два першыя неслі прадбачаную ім службу яшчэ пры санацыі, а школьны нават і ў 1970-я гады; зараз яны з'яўляюцца прыватнымі жылымі дамамі. У трэцім будынку, які ў наш час называлі „новай школай”, дзеці вучыліся аж да пачатку 1990-х гадоў, да збудавання новага школьнага комплексу. Пасля будынак нейкі час пуставаў і ў ліпені 2000 года тадышнія гмінныя ўлады перадалі яго мясцовым католікам на капліцу. Трэба пры нагодзе адзначыць, што пры санацыі найпрыгажэйшы царскі будынак з чырвонай цэглы таксама выконваў ролю каталіцкай капліцы, а ў суседніх, драўляных, былых шпітальных будынках быў сірацінец, якому шэфстваваў Павятовы камунальны звяз у Бельску-Падляшскім. Усе тыя будынкі — у якіх былі і прадшколле, і школа, і дом культуры, і бібліятэка, і клуб-кавярня, і ўправа гміны — былі ў 1986 годзе знесены пад пляц для пабудовы новай, вялікай школы. Цікава і тое, што ўсе людзі, якія карысталіся пабудаванымі ў царскі час будынкамі, захавалі да іх сентыментальнасць і шкадуюць, што іх няма, хаця на іх месцы красуецца велізарны школьны будынак.

Сустрачане некалькі гадоў пасля

Мастацтва, тэатр, паэзія, гісторыя, але перш за ўсё журналістыка — гэта далёка не ўсе віды дзейнасці, якімі займаліся ўдзельнікі ўсіх Сустрэч „Зоркі".

Міхась СЦЕПАНЮК

Хіба цяжка было б знайсці ў беларускім асяроддзі асобу, якая пра Сустрэчы не чула ці нават у іх не ўдзельнічала. Ва ўсіх спатканнях прыняло ўдзел некалькі дзесяткаў (калі не соцень) маладых беларусаў з усяго Падляшша.

Працавалі з імі вядомыя гісторыкі, журналісты, мастакі, настаўнікі. Дастаткова толькі ўспомніць прозвішчы некаторых гасцей і дакладчыкаў, якія пераказвалі сустрачанам свае веды: Лявон Тарасэвіч, Алег Латышонак, Лена Глагоўская, Дарафей Фіёнік, Аляксандр і Ян Максімюкі, Яўген Мірановіч, Уладзімір Гайдук, Надзея Артымовіч ды многія іншыя.

Па сённяшні дзень хіба не было ніводнага беларускага праекта на Падляшшы, які б сваім маштабам ахапіў столькі тэм, згуртаваў столькі маладых людзей з усёй Беласточчыны і быў бы так канструктыўны. Пра канструктыўнасць Сустрэч можа сведчыць факт, што пасля чарговых выпускаў артыкуламі аб Сустрэчах і з Сустрэч запаўнялася не толькі „Зорка", але таксама многія старонкі „Нівы".

Арыгінальнасць і непаўторнасць Сустрэч (якія адбываюцца і надалей, толькі не так часта як у мінулых гадах) ды проста цікавасць сталі штуршком для напісання гэтага (спадзяюся што не будзе ён першым і апошнім) тэксту.

Захацелася мне проста паразмаўляць з удзельнікамі Сустрэч, якія напрыканцы 1990-х гадоў актыўна ўдзельнічалі ў праекце. Чым яны зараз займаюцца? Як успамінаюць свой удзел у Сустрэчах „Зоркі"? Ці Сустрэчы ў нейкі спосаб паўплывалі на іх жыццёвыя рашэнні?

Думаю, што ў гэтай тэме няма непатрэбнага пафасу і пахвальных гімнаў. Больш тут звычайных успамінаў, часам цікавых, нярэдка вельмі забаўных. Варта таксама даведацца, што зараз дзеецца з людзьмі, якія публікаваліся ў „Зорцы" ці часам у „Ніве".

Першымі асобамі, з якімі сустракаюся, каб пагаварыць пра Сустрэчы „Зоркі", невыпадкова былі Жанэта Роля ды Тамаш Суліма — удзельнікі неіснуючага ўжо кабарэ „Куль", якое было непасрэдным вынікам занятасці бельскіх вучняў у праекце „Зоркі".

Жанэта Роля: з сустрэч пачалося маё пісанне вершаў

Жанэта Роля — выпускніца Міжфакультэтных індывідуальных гуманітарных студыяў на Каталіцкім Люблінскім універсітэце па спецыяльнасці псіхалогія і журналістыка. Зараз Жанэта працуе псіхолагам у адной з бельскіх гімназій ды ў апякунска-выхаваўчай установе ў Беластоку.

На пытанне пра першую асацыяцыю, калі чуе лозунг: Сустрэчы „Зоркі", Жанэта хутка адказвае:

«Нарва і гатэль „Пад акацыяй". Якраз там я выконвала ролю Чырвонай Шапачкі. Былі гэта мае першыя акцёрскія спробы. А з Сустрэч у Нарве запомнілася мне таксама песня „Ты прыходзь пакуль не сплю" ў выкананні Анэты Яканюк. Увогуле Сустрэчы „Зоркі" гэта напэўна адзін з лепшых перыядаў у маім жыцці.

Калі гаворка пра людзей, гэта перш за ўсё Гандзя Кандрацюк. Асобай, якую вельмі добра ўспамінаю і ад якой вельмі многа я даведалася гэта Лена Глагоўская. А найлепш гулялі мы ў кампаніі Алега Кабзара і Аліны Ваўранюк. Памятаю яшчэ таксама сустрэчы ў Бандарах (люты 1996 года) і вельмі цікавае спатканне з Уладзімірам Гайдуком».

Жанэта ў свой час займалася паэзіяй, прымала ўдзел у некалькіх выпусках Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы.

«Хіба якраз ад Сустрэч „Зоркі" пачалося маё пісанне вершаў. Цяпер ужо не пішу. Здаецца, што калі скончыўся мой удзел у Сустрэчах, скончылася таксама маё пісанне.

Цікава было таксама прыняць больш актыўны ўдзел у Сустрэчах. Вялікім вылучэннем было для мяне тое, што ў Старыне вялі мы заняткі пра фельетон».

Вынікам удзелу Жанэты і іншых бельскіх вучняў у Сустрэчах „Зоркі" было заснаванне кабарэ „Куль". Галоўнай інспірацыяй для яго паўстання былі якраз прадстаўленні падчас Сустрэч. Маладыя людзі рыхтавалі, між іншым, новыя варыянты вядомых беларускіх песень, выкананыя пад мелодыю сучасных гітоў. Пачаткова кабарэ „Куль" выкарыстоўвала ў галоўным сустрачанскія аранжацыі. Пасля паўсталі многія песні і сцэнкі, падрыхтаваныя адмыслова самім кабарэ.

Тое, што кабарэ было вельмі важным і цікавым рэзультатам Сустрэч падкрэслівае таксама Жанэта.

«Вельмі добра ўспамінаю кабарэ „Куль" і нашы вельмі энергетычныя рэпетыцыі ў майстэрні Алега Кабзара. Таксама вельмі прыемна ўспамінаю нашы выступы, асабліва калі падчас рэпу вучні рэагавалі вельмі актыўна».

З перспектывы некалькіх гадоў Жанэта (у апошніх сваіх Сустрэчах прымала яна ўдзел яшчэ ў ліцэі) бачыць, што многія яе рашэнні ці дзеянні не мелі б месца, калі б не Сустрэчы „Зоркі".

«Няма чаго ашуквацца, калі б не Сустрэчы „Зоркі", не прыняла б я ўдзелу ў алімпіядзе беларускай мовы і не закончыла б такіх студыяў, ніколі не зацікавілася б таксама журналістыкай.

У студэнцкі час была я рэдактарам газеты „Акапіт" выдаванай студэнтамі журналістыкі. Выкарыстоўвала я там многія веды з Сустрэч „Зоркі"».

Тамаш Суліма: Сустрэчы зрабілі мяне гуманістам

Пра Тамаша Суліму чулі напэўна многія. Бард з Бельска-Падляшскага, які ад некалькіх гадоў выступае на фестывалі „Бардаўская Восень". Тамаш — выпускнік этналогіі ў рамках Міжфакультэтных індывідуальных гуманітарных студыяў на Варшаўскім універсітэце. Штодзень працуе членам рэдакцыйнай калегіі інтэрнэт-партала Cerkiew.pl.

«Сустрэчы „Зоркі" гэта проста інстытут, — кажа Томэк. — Мяне вельмі цікавіў артыстычны бок праекта. На добры лад трэба сказаць, што два напрамкі, журналісцкі і мастацкі, узаемна дапаўняліся, але больш гульні было хіба пры мастацкім, калі можна было паспяваць, пажартаваць, пагуляць у тэатр.

У журналісцкім напрамку трэба было больш мабілізацыі. Трэба было ўставаць ранкам, былі нейкія думкі, але трэба было іх зрэалізаваць: выйсці, пагаварыць з людзьмі, напісаць тэкст».

Калі ідзе пра „спадчыну" Сустрэч, Томэк, падобна як і Жанэта, гаворыць пра кабарэ „Куль".

«Быў гэта вельмі файны спосаб каб арыгінальна перайсці праз школу, каб цікава пражыць ліцэй. Трэба адкрыта сказаць, што дзякуючы кабарэ „Куль" нас у нейкі спосаб паважалі».

Томэк падкрэслівае, што Сустрэчы „Зоркі" адыгралі вялікую ролю ў ягонай самасвядомасці.

«Паўплывалі на яе два фактары: Сустрэчы „Зоркі" і ўвогуле „Зорка" з „Нівай", а таксама Дарафей Фіёнік. Непасрэдным вынікам гэтага было маё зацікаўленне этнаграфіяй Падляшша. Свае зацікаўленні працягваў я на студыях. Хто ведае, калі б не Сустрэчы „Зоркі" і Дарафей Фіёнік, магчыма што сёння рабіў бы я нешта зусім іншае?»

Калі гаворка пра ягоную мастацкую дарогу, бельскі бард таксама заўважае ўплыў Сустрэч.

«Некалькі гадоў пасля Сустрэч пачаў я выступаць на „Бардаўскай восені". Напэўна без кабарэ „Куль" і без „Зоркі" цяжка было б гэтае здзейсніць. Гэта дало мне адвагу, каб зрабіць нешта ў мастацкім напрамку. І адвага выходзіла якраз ад Сустрэч і кабарэ „Куль".

Сустрэчы „Зоркі" зрабілі мяне ў нейкі спосаб больш уражлівым. Быў такі дзень, калі ўзяў я гітару ў рукі. І зараз паўстае пытанне: ці калі б не Алег Кабзар, Дарафей Фіёнік ці Пятрусь Пракопчык калі-небудзь я б гэтае зрабіў?

Разглядаючы ўплыў Сустрэч „Зоркі" ў шырэйшым плане трэба сказаць, што ні ў пачатковай школе, ні нават у першым класе ліцэя я не быў такі гуманіст. Больш цікавіла мяне інфарматыка, камп'ютары. У нейкай частцы таксама і Сустрэчы зрабілі мяне гуманістам. Закончыў я ліцэй у гуманістычным класе, пасля вышэйшая навучальная ўстанова і таксама гуманістычная спецыяльнасць. Дзякуючы Сустрэчам набыў я нейкі гуманістычны варштат».

PS. Калі і Ты прымаў/прымала ўдзел у Сустрэчах „Зоркі" і хочаш пра гэтае пагаварыць, чакаю твайго э-мейла па адрасе: muryn1@o2.pl

Вікторыя Вікі

„За цябе балела ўся краіна. Гэта перамога не толькі твая, але і ўсяго беларускага народа”, — так з поспехам у прэстыжнейшым тэнісным спаборніцтве ў Маямі віншаваў 19-гадовую мінчанку Вікторыю Азаранку сам Аляксандр Рыгоравіч. Наш польскі прэм’ер, магчыма, нават пры такой нагодзе, заўважыў бы, што прэзідэнту выпадае гаварыць, а чаго не выпадае. Аднак „інструкцый” нашага прэм’ера не выпадае кіраваць у адліжны апошнім часам палітычны беларускі бок, таму дазволю гэтакую прывілею самавольна ўзяць на сябе. Бо выказванне спадара Лукашэнкі патрабуе дапаўнення: за беларускую ракету балеў значна большы, чым названы прэзідэнтам, круг балельшчыкаў.

Адкуль такое маё меркаванне? Бо ж заглядаў я ў некаторыя замежныя парталы, дзе на тэму перамогі беларускай тэнісісткі над першай ракетай свету, амерыканкай Сірэнай Уільямс, выказваліся звычайныя балельшчыкі. „Прызнаюся, — напісаў адзін з іх — што сёстры Уільямс крыху надаелі ўжо мне, іх вынікі сталі прагназавальнымі. Таму я вельмі рады перамозе Азаранкі, цудоўна бачыць маладых людзей, якія выходзяць на перадавую і ўносяць азарт у гульню. Гэта прадстаўнікі небагатых краін, якія кідаюць выклік магутным і напышлівым. І вялікая пашана Сірэне за ўсведамленне, што яе саперніца гуляе лепш”. Славацкая ж штодзённа „Pravda” дала апісанню фінальнага матча ў Маямі загаловак „Беларускі ўраган Азаранка здзьмуў Сірэну 6:3, 6:1”.

У лік балельшчыкаў за Вікторыю Азаранку залічаю і сябе. Праўда, балельшчык з мяне надта памяркоўны, бо ж, для прыкладу, не быў я на ніводным матчы беластоцкай спартыўнай візіткі — „Ягелоніі”. І нават спартыўныя падзеі ў тэлевізары даволі мне абыякавыя, бо найбольш, бадай, масавы футбол зводзіцца да, па сутнасці, няспыннага штурхання мяча нагамі не надта ўмелых гульцоў. Ды і элітарны тэніс таксама вельмі часта бывае нудным адбіваннем ракетай мячыка за сетку. Аднак гэтыя два названыя віды спорту здаюцца быць найбольш папулярнымі, бо іх правілы вельмі простыя і, у выніку, выгадныя найбольш масаваму, лянівому гледачу.

Мабыць і фінальны матч у Маямі не выклікаў бы майго зацікаўлення, калі б яго ўдзельніцы былі іншыя. Але... Турнір у Маямі сабраў найлепшыя ракеты свету. Сама Вікторыя Азаранка, якая на старце спаборніцтва была дзесятай у суцэльным рэйтынгу тэнісістак, была пасеяна ў турніры з адзінаццатым рангам! І яна ў фінале выходзіць насупраць непераможнай у апошні час Сірэны Уільямс, якую многія спартыўныя назіральнікі лічаць найлепшай тэнісісткай за ўсю гісторыю. Ці ж у такіх абставінах мог не спрацаваць у мяне статкавы інстынкт? Калі ў нашай „агромністай такой грамадзе” засвяціла яркая спартыўная зорка? Якая выходзіць як Давід супраць Галіяфа?

Сам сабе дзівуюся, што не хваляваўся я за вынік — нейкі ўнутраны голас апавяшчаў мне, што Вікторыя выйграе; нават ейныя першыя няўдачы не пахіснулі гэтай маёй упэўненасці. Быў для гэтага і рацыянальны грунт: на пачатку бягучага года гэтыя дзве тэнісісткі сутыкнуліся з сабой у Мельбурне; тады перамагла Сірэна ў выніку здачы матча Вікторыяй з-за нямогласці ў другім сеце. Аднак першы сет выйграла тады Вікторыя... Чаму ж цяпер не магла б яна выйграць патрэбных для перамогі двух сетаў?..

У Маямі абставіны змяніліся: цяпер Сірэна гуляла з траўмай, а Вікторыя засцерагалася ад тэрмічнага ўдару, які знямог яе ў Мельбурне. Траўма Сірэны паўплывала на вынік матча, аднак дала ёй і прызнанне інтэрнаўтаў, якія высока ацанілі ейную вытрымку і сілу волі. Ды і Віка — такая клічка ў Вікторыі — напэўна павысіла не толькі свой спартыўны рэйтынг. Мяркую, што яна выдатна пашырыла круг сваіх спартыўных сімпатыкаў. Як жа прыемна было глядзець успрыманне Вікторыяй ейных няўдач з усмешкай — гэта рэдкая з’ява на кортах. Многія ж удзельнікі шчодра фінансаваных тэнісных турніраў, мабыць думаючы пра фінальныя чэкі з пераводамі на свае банкаўскія рахункі, паводзяць сябе не надта сімпатычна...

Вікторыя Азаранка зарабіла ў Маямі семсот тысяч долараў. У параўнанні з футбалістам Дэйвідам Бэкхемам, які зарабляе ў год звыш трыццаці двух мільёнаў еўра, у тым ліку 26 мільёнаў за рэкламы, гэта рэлятыўна нямнога. Але краса і сімпатыя ў публікі прывядуць у рэкламу і Вікторыю Азаранку. Астаецца тады далей балець за яе, каб і да рэкламы, так як да гульні на корце, ставілася яна з рэфлексіўнай усмешкай, каб галавакружныя поспехі не паставілі яе — як гэта часта з людзьмі бывае — з ног на галаву.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Існуе на карце Беларусі горад, з якім многа дзесяцігоддзяў запар асацыявалася беларускае жыдоўства. Горад гэты носіць назву Бабруйск і стаіць ён на берагах рэк Бабруйкі і Бярэзіны ды з’яўляецца адным з буйных беларускіх паселішчаў.

Стагоддзе таму беларускія гарады былі жыдоўскімі. Яўрэі складалі большасць сярод гарадскога насельніцтва Беларусі, якое тады значна ўступала сялянскаму. Сённяшнія рэаліі зусім іншыя. Гараджан у Беларусі амаль удвая больш за сялян, а яўрэі знаходзяцца ўжо не ў першых радках нацыянальнага складу краіны. Прычына вядомая — вяртанне жыдоў на сваю гістарычную радзіму, што было, па вялікім рахунку, для Беларусі сумнай з’явай, якім ёсць, бадай, кожнае развітанне з добрымі знаёмымі і суседзямі.

Але Бабруйск застаўся, і каб даведацца аб ім крыху больш, варта завітаць на аднайменны сайт, што месціцца ў інтэрнэце па адрасе: http://babruisk.belarda.org.

Сайт называецца рэгіянальным парталам. Зроблены ён даволі проста і традыцыйна. Першая старонка падзелена на тры часткі — злева выйсці да рубрык, а пасярэдзіне і справа — навінныя паведамленні. Ідуць навіны паасобку: першыя — рэгіянальня, другія — беларускія і сусветныя. Калі першыя без сумнення неабходныя такому сайту, то вартасць другіх выклікае пытанне — усё ж такі для такога роду падзей маюцца адмыслова арыентаваныя на іх агульнабеларускія парталы.

Аўтары сайта як добрыя экскурсаводы пачынаюць знаёміць віртуальнага турыста з геаграфічным палажэннем свайго горада. Не забываюцца яны і пра кліматычныя ўмовы, а таксама пра карысныя выкапні, што былі знойдзены на навакольнай ад Бабруйска тэрыторыі.

У наступнай рубрыцы ідзе расповед пра насельніцтва горада. Як было вышэйадзначана, цяпер сярод бабруйчан большасць зусім не яўрэі, а беларусы і рускія.

Найбольш важнай старонкай распрацоўшчыкі сайта лічаць „Гісторыю Бабруйска”. Таму падаюць яе на дзвюх мовах — беларускай і англійскай.

„Наш горад адзін з найстарэйшых гарадоў Беларусі, размешчаны на высокім правым беразе ракі Бярэзіны, — робяць экскурс у пачатак гарадской гісторыі аўтары рэгіянальнага партала. — Археалагічныя раскопкі сведчаць аб тым, што ў V-VI стст. на рацэ Бярэзіне знаходзілася гарадзішча славян, а знаходкі каменных прылад даюць пацверджанне таму, што да сучаснага Бабруйска чалавек жыў у перыяд каменнага веку. Узнікненню селішчаў, а пазней і горада спрыялі добрыя прыродныя ўмовы, выгоднае размяшчэнне.

Упершыню Бабруйск узгадваецца ў 1387 г. у дамоўнай грамаце вялікага князя літоўскага Ягайлы свайму брату Скіргайлу на права валодання Троцкім ваяводствам. На працягу працяглага часу назва горада неаднаразова трансфармавалася: Бобруеск, Бобровск, Бобрусек, Брусек на Бярэзіне”.

Па ўсім відаць, што ўладальнікі рэгіянальнага партала не надта заклапочаныя эканамічным развіццём роднага горада і прыцягненнем да яго інвестыцый. Старонка „Эканоміка Бабруйска” дае толькі некаторыя факты эканамічнага жыцця і зусім не распавядае пра асаблівасці, што ўласцівыя мясцоваму спажыванню.

У той жа час не абыходзіць рэгіянальны партал спартыўную тэматыку — падае расклад гульняў вядомай на ўсю Беларусь футбольнай дружыны „Белшына”.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Наш Маямі

Тэнісны турнір у амерыканскім горадзе Маямі выдаўся надзвычай удалым для беларускіх прадстаўнікоў. Прыма айчыннага тэніса 19-гадовая Вікторыя Азаранка ўпершыню ў сваёй кар’еры выйграла тытул у адзіночным разрадзе. Азаранка ўпэўнена разбіралася з саперніцамі і сапраўдныя цяжкасці зазнала толькі ў паўфінале, дзе ёй супрацьстаяла атлетычная расіянка Святлана Кузняцова, на рахунку якой нямала дасягненняў. Спрэчка візаві была прынцыповай і з-за таго, што тэнісісткі стаялі побач у рэйтынгу. Першая ракетка Беларусі досыць упэўнена ўзяла першы сет — 6:3. У другім ініцыятыва перайшла да Кузняцовай, якая выйграла партыю з лікам 6:2. У трэцяй вырашальнай партыі змаганне было зацятым і завяршылася на карысць беларускі — 7:5. Матч доўжыўся 2 гадзіны 40 хвілін. Вікторыя перамагла найперш дзякуючы ўдалай гульні на сваёй падачы. А ў фінале Азаранку было ўжо не спыніць. Пад яе націскам была змушана капітуляваць сама Сірэна Уільямс, 1-я ракетка свету. На афармленне перамогі ў турніры СТА першай катэгорыі Азаранцы спатрэбіліся два сеты і гадзіна з хвосцікам — 6:3 і 6:1. Наша тэнісістка ўзяла галоўны прыз, зарабіўшы за тыдзень ажно 700 тысяч долараў. Гэта ўжо трэці тытул Азаранкі сёлета ў індывідуальнай намінацыі. Баланс яе гульняў у бягучым сезоне сапраўды ўражвае — 23:2. І то, адна з дзвюх паразаў здарылася на адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі з-за траўмы, дарэчы ў паядынку з той жа малодшай Уільямс.

Парадаваў сваіх прыхільнікаў і Максім Мірны, які канчаткова сканцэнтраваўся на парным разрадзе і перажывае зараз рэнесанс. Прынамсі, яго поспехі ў пары з ізраільцянінам Эндзі Рамам растуць літаральна на вачах. Мірнага не назавеш навічком турніру ў Маямі. Наадварот, гэта адзін з самых паспяховых для яго гарадоў. Тут ён ужо перамагаў у парным разрадзе — у 2003 годзе разам са швейцарцам Роджэрам Федэрэрам, а ў 2005 і 2006 гадах двойчы са шведам Юнасам Б’ёркманам. І вось новы поспех у тандэме з Рамам. У фінале інтэрнацыянальны дуэт у напружаным змаганні адолеў аўстралійцаў Эшлі Фішэра і Стывена Хуса — 6:7 (4:7), 6:2, (10:7). Да слова, гэта быў першы падобны фінал у Маямі з 1991 года, калі ў вырашальным матчы сустрэліся не сеяныя пары. Нагадаю таксама, што на папярэднім турніры ў Індыян-Уэлсе Мірны з кампаньёнам дасягнулі фіналу, а зараз прыбралі да рук другі супольны тытул „Мастэрс”. А ўвогуле ў Максіма Мірнага гэта ўжо 36-я (!) парная вікторыя ў кар’еры. У свеце няшмат знойдзецца тэнісістаў, за плячыма якіх такі салідны „багаж”.

Поспех Азаранкі дазволіў ёй у сусветнай класіфікацыі абысці „на віражы” дзвюх расіянак — Святлану Кузняцову і Надзею Пятрову, цяпер Вікторыя — 8-я ракетка свету. Наперадзе яе Сірэна Уільямс (ЗША), Дынара Сафіна (Расія), Алена Дзяменцьева (Расея), Алена Янкавіч (Сербія), Вінус Уільямс (ЗША), Вера Званарова (Расія) і Анна Іванавіч (Сербія). Звяртае ўвагу той факт, што ў дзесятцы лепшых зараз 8 славянак і 2 амерыканкі. У сотку мацнейшых уваходзяць яшчэ дзве беларускі — Вольга Гаварцова (57-я) і Настасся Якімава (74-я). Калі ў дзяўчат назіраецца прагрэс, то ў беларускіх хлопцаў проста бяда. Пасля выхаду „на пенсію” Уладзіміра Ваўчкова і канцэнтрацыі на парным разрадзе Мірнага, першая ракетка Беларусі Уладзімір Ігнацік займае ў сусветным рэйтынгу толькі 473-е месца, што яскрава сведчыць пра заняпад айчыннага мужчынскага тэніса.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

З ПАДЛЯШСКАГА СВЕТУ

Про мое Стрыкі

фота з архіва Рыгора Зінкевіча

Колектывны здымок стрыковцюв в 1971 рокові, на фоні хаты Зінкевічув. В сэрэдіні ягуштовскі батюшка о. Міколай Головчыньскі

З нэмалым зацікавленём чытаю матэрыялы Александра Вербіцкого, якіе можна назваті „Вандроўкамі па роднай зямлі". Дорогі, по якіх ходіт автор, нэ одну і я сходів, чы сколесів. Але нэ всюды добравсе. Дознавсе я, на прыклад, куды вэдэ дорога, якая одходіт в Нурцёві, коло моста, в сторону Дубна. Нэ раз, проежджавшы Мельніцкім Гостінцём з Бельска до Мілейчыч, хотелосе мне в еі скрунуті. Тэпэр знаю, што нэ вэльмі вона проезная.

В остатнім нумэрові „Нівы" журналіст знов трафляе до вёскі Стрыкі, бліскуй моёму сэрцю. Тут в часы дітіньства бывав частовато, обовязково на Юрыя і Покруовку, в госцях у тёткі Марысі Кондратюк. Была вона дочкою Олеся Кондратюка, брата моеі бабулі, які в Стрыкі прыступів со Студзівуод. У дядька Олеся была шчэ дочка Ніна, што вышла замуж до Ягуштова. А еі дочка — светлуй памэті Зінаіда Новіцка, дырэктор белоруского ліцэя.

Тётка Манька стрыковськая, як еі у нас называлосе, робіла вэльмі гожы пісанкі, як і всіе еі суседкі. Пісала іх стугавкою, а взоры былі поліхромны, з пэрэвагою тэмных колёрув. Обовязково, на Вэлікдэнь пэрэдавала нам волочобнэ со своіх пісанок. І хоть нэ заховаласе ні одна з іх, іх образ в моюй памэті муцно трывае.

Од тёткі Марысі достав я шчэ в 1987 рокові одін з пэршых экспонатув до нашого студзіводзкого музея — стародавні жорна в кадлубкові. Такіе самы жорна оддав мніе тогды стрыкуовські солтыс пан Сычэвскі. Он жэ пэрэдав і плетёну борону по своім діедові. Добрэ помню тожэ руок 1988 і рэйд белорускуй молоді, які організовав тэатр „Парнас". Пэршы этап вюв со Студзівуод до Стрыкуов. Шлі чэрэз Шасталы, урочышчэ Боровіска, шчэ бэз цэрквы. А в Стрыках взялі акордэон і цілым гуртом гралі і співалі, ездзівшы на кунным возі, кругом сэла.

Колі бывав я в Стрыках, заходів таксамо до хаты Івана Шымковіча. Всіе ёго в сэліе поважалі, нэ туолькі з-за того, што быв іконопісцом і мастаком. Быв просто вёсковым авторытэтом. Співав в хоры ягуштовскуй цэрквы, чытав по словянску. Добрэ выховав трое діті. Найстарша дочка Зіна, Царство юй небеснэ, пэрэняла татовы таланты і займалася жывопісом. В 2004 рокові наш музей зорганізовав ім выставку. Внук Івана Шымковіча, муой двоюродны брат Хрыстофор, вядомы як „Бусёл", свого часу быв суорганізатором і гітарыстом вядомого гурту „Брага".

Александр Вербіцкі вспомінае стрыкуовскі ветрак. У мэнэ по ім тожэ ностальгія. То быв так характэрны элемэнт краёвіду, што здаецце вечны. Напочатку 90., в кругові моіх колег з Брацтва православнуй молоді з Бельска повстала думка, коб ветрак одкупіті і зробіті тут базу. Але ёго справы маёнтковы былі так покручоны, што мы покінулі стараня. Потуом шчэ Грышка Зінкевіч, тэпэрышні іконопісец, а муой кум, накручував мэнэ знов робіті штось з ветраком. І нэ одін стрыковэць тужыв за ім. Але забраковало відно рэшучосці... І так загінув ветрак з краёвіду.

В остатню нэдіелю задзвонів до мэнэ давні стрыковэць, коб поговорыті про справу задбаня тзв. „шчурэвськіх могілок". Нэкрополія відно з XVIII віеку. Тут заховалосе туолькі пару камэнюв з крыжамі. А чом чоловіек позвонів, бо прочытав матэрыял в „Ніві" про Стрыкі. І пробуділасе в ім знов ностальгія і потрэба зробіті штось для своеі малэі батькувшчыны.

Автор матэрыялу згадуе про табліцю пры стрыковскуй цэрковці. Так, міев я до еі дочынене, але нэ основное. На просьбу Ігора Лукашука, які рэалізував проект „Краіна Ягуштово", напісав я гісторычны тэксты до парох такіх табліць.

Пры стрыкуовськуй цэрковці св. Онуфрыя, якую збудовалі в 1814 рокові, спочывае Анна Чэрнявска, з дому Кондратюк, сэстра моеі бабулі. Анна вышла замуж до Грабовця за Тімофея Чэрнявского. У іх было чэтвэро діті.

Пры цэркві в Стрыках е могіла Івана Гіжэвского, внука о. Антонія Гіжэвского, будовнічого стрыкуовскуй цэркві. Шчэ до 1992 р. намогільны помнік быв закопаны пры храмі. Хтось колісь ёго побів. Чом, нэвядомо? А потум ёго знашов інж. Борыслав Рудковскі, які разом з інж. Міколаем Новіцкім робів померы на тутэйшых могілках. Посля, разом з Аліком Юрчуком, тэпэрышнім вікарным дубіцкого прыхода, мы той помнік зложылі і обновілі.

А шчэ вспомінаецце мніе початок 90., колі з Мірком Здрайковскім выбралісе мы ровэрамі на стрыкуовські могілкі, коб поставіті повалёны дэрэвяны крыжы. Вкопалі іх цілы рад вздовш огороджы.

Такіе то моіе стрыковскіе вспоміны. Ага, шчэ про одін новейшы факт. В 2005 рокові одбывсе в Стрыках мастацкі пленэр. Цікавы то былі дніе. Жывопісом займавсе Олег Кобзар, Пётр Гаган, Аня з Любліна. А Івона і Мірэк Якімюкі фотографовалі. Базою была іконопісна майстэрня Грышкі Зінкевіча. Колі мастакі ішлі в пленэр, вуон муог спокуйно пісаті іконы. Тогды шчэ я нэ знав стрыковця Юрка Дэмбовского, чоловека з мастацкою душою. В 2007 р. міев вуон у нас пэршу выставку своіх чудных фотографіі.

Такі е моіе Стрыкі.

Дорофей ФІЁНІК

Па дарозе ў Саўляны

Паехаў я 31 сакавіка г.г. у вёску Саўляны, якая знаходзіцца каля Беластока. А гадзіне 17.35 з цэнтра горада забраў мяне аўтобус лініі № 13. Як у дарогу ў вёску быў ён адпаведны: больш брудны ды з лавачкамі для сядзення абшытымі дэрмацінам не аднаго колеру, а аж трох: цёмна-чырвонага і розных адценняў карычневага. У гэтым жа гарадскім аўтобусе — ехаў ён па вуліцы Сянкевіча і далей па вул. 27 Ліпеня — рысора над заднімі коламі грукацела так, што ў вушах калола — вось такая траскатня! Мала таго — дзверы з заду аўтобуса не адчыняліся і тэба было шукаць іншага выхаду. Вось так ашарашаны весткай, што і дзверы папсаваныя, даехаў я на апошні аўтобусны прыпынак у канцы вул. 27 Ліпеня, за колішняй цяпліцай.

Далей я пайшоў абочынай асфальтаванай рухлівай дарогі ў напрамку Грабаўкі. На скрыжаванні гэтай дарогі з дарогай у Саўляны павярнуў налева. Тут абочына і дарога былі вузкія.

На скрыжаванні дарог на ўказальніку прачытаў я: „Саўляны 1 км" ды — як пасля даведаўся — салгалі: будзе каля 2 км. Па дарозе два крутыя павароты, адзін з іх у лесе, схаваны за дрэвамі. Равы паабапал дарогі засмечаныя, поўныя ўсялякай напатрэбшчыны: макулатуры, шын ад аўтамабільных колаў, пустых пластмасавых бутэлек і бляшанак з-пад кансерваў. У адным месцы асфальтавая маставая пашкоджаная пры ўездзе з бакавой дарогі. Тут асфальт раструшчылі грузавікі.

Па дарозе ў Саўляны тратуараў няма. Ноччу ісці вельмі небяспечна. На асфальце легкавушка можа падбіць.

Саўляны — вёска за горадам.

(яц)

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — арабскую пагаворку.

1. сігнальны паплавок на рацэ, возеры ці бухце для абазначэння мелі або месца рыбацкай сеці = 38 _ 35 _ 34 _;

2. орган слыху = 27 _ 37 _ 40 _ 39 _;

3. галасаванне для вызначэння, напрыклад, дэпутатаў у парламент = 22 _ 23 _ 32 _ 33 _ 30 _ 31 _;

4. гарадок між Лідай і Валожынам = 2 _ 11 _ 28 _;

5. від сінтэтычнага валакна (з рускай абрэвіятуры ад *Лаборатории высокомолекулярных соединений Академии наук*) = 9 _ 13 _ 14 _ 8 _ 7 _ 3 _;

6. блакітнацветны валакністы сімвал беларускіх палёў = 25 _ 20 _ 21 _;

7. сумесь тлушчу з лекавымі сродкамі = 15 _ 19 _ 36 _ 4 _;

8. левы прыток Прыпяці з крыніцамі між Мінскам і Івянцом = 24 _ 12 _ 10 _ 6 _;

9. фігурная металічная накладка на абразах, якая пакідае адкрытымі толькі твар і рукі святога = 17 _ 26 _ 29 _ 18 _;

10. агульнае цяжкае парушэнне функцый арганізма ў выніку моцнага псіхічнага ўзрушэння = 5 _ 16 _ 1 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 11 нумара

Слалам, Рагнеда, вырай, вядро, вертыкаль, Суомі, бровар, Ур, сінонім, кандуктар, туя, прагул.

Рашэнне: **Не давярай новаму сябру і старому ворагу.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 500 egz.

Родам з Беласточчыны

Даследчыца беларускай мовы 1920-х — 1930-х гадоў

Застаць дома ў горадзе Сідар-Фолс (ЗША) доктара філалогіі, выкладчыцу кафедры сучасных моваў Універсітэта Паўночнай Аёвы ў горадзе Сідар-Фолс штата Аёва ў ЗША беларуску з Гайнаўкі Аліцыю Барута-Садкоўскі вельмі цяжка. Нядаўна яна зноў пэўны час адсутнічала, бо была ў Маскве. З Масквы вярнулася дамоў, але зноў яе чакаюць справы выкладчыцкія, справы навукоўцаў-славістаў то ў Еўропе, то ў Канадзе на гадавым з'ездзе Таварыства амерыканскіх славістаў, то ў іншых краінах і кантынентах. І каб пагутарыць хаця б па тэлефоне, ці праз інтэрнэт, нашу зямлячку трэба было шукаць усюды. Так я і рабіў некалькі тыдняў і нават месяцаў, пакуль нарэшце не дачакаўся ад яе весткі. Спадарыня Аліцыя пагадзілася адказаць на мае пытанні і перадала самыя шчырыя прывітанні ўсім беларусам Беласточчыны і журналістам тыднёвіка „Ніва", а таксама свае велікодныя віншаванні.

Аліцыя Барута-Садкоўскі з мужам

— Спадарыня Аліцыя, скажыце, калі ласка, дзе і ў якой сям'і Вы нарадзіліся?

— Я нарадзілася ў Гайнаўцы 27 сакавіка 1961 года. Мой бацька быў родам з вёскі Скупава, але, калі жаніўся, жыў у Гайнаўцы. Яго ўжо няма ў жывых, ён памёр у 1982 годзе. Мама родам з Ласінкі. Яна, дзякаваць Богу, яшчэ жыве ў Гайнаўцы. Мама і тата ў хаце заўсёды размаўлялі на мясцовым дыялекце роднай беларускай мовы. У іх і я навучылася роднай мове, якую берагу ў сэрцы да сённяшніх дзён.

— Дзе Вы вучыліся, што скончылі?

— Пачатковую і сярэднюю адукацыю я атрымала ў Гайнаўцы. Скончыла ў Гайнаўцы беларускі ліцэй. Затым паступіла ў Варшаўскі ўніверсітэт на факультэт беларуска-рускай філалогіі, дзе ў 1985 годзе атрымала ступень магістра. Тэмай магістэрскай працы з'явіліся польска-беларускія літаратурныя адносіны ў першай палове 1980-х гадоў, што потым паўплывала на тэму маёй доктарскай працы.

— А які лёс Вас закінуў ажно ў Амерыку?

— Калі вучылася ў Варшаве, пазнаёмілася са сваім будучым мужам Конрадам. Ён родам з Польшчы, але ўсё жыццё яго бацькі, браты і ён жывуць у ЗША. Таму пасля заканчэння ўніверсітэта я паехала да яго і ў 1987 годзе выйшла замуж. Адсюль у мяне цяпер і двайное прозвішча: Барута-Садкоўскі. Муж мой — гісторык, выкладае гісторыю Еўропы. У нас растуць два сыны — Бен, яму 17 гадоў, і Караль, яму 15 гадоў.

— І чым Вы займаліся ў Амерыцы, калі туды прыехалі?

— У 1988 годзе я паступіла ў Мічыганскі ўніверсітэт у г. Ан-Арбор штата Мічыган на кафедру славянскіх моў і літаратур, дзе ў 1997 годзе атрымала ступень доктара філалогіі.

— І якая была тэма Вашай доктарскай дысертацыі?

— Па-беларуску тэма маёй доктарскай дысертацыі гучыць так: „Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў 1920-х і 1930-х гадах на падставе гарадскіх варыянтаў Гародні, Вільні і Менска і ўплыў расейскай і польскай моў на гэтае развіццё". На ангельскай мове гэтая тэма гучыць неяк не так доўга, як па-беларуску.

— Чым Вы займаліся пасля абароны доктарскай дысертацыі?

— У 1995 годзе я з сям'ёй пераехала ў Аёву у горад Сідар-Фолс, дзе цяпер працую ва ўніверсітэце Паўночнай Аёвы, вяду заняткі па рускай і польскай мовах, па рускай і польскай літаратуры і агульныя заняткі па гісторыі Расіі, а таксама працягваю свае даследаванні ў галіне беларускай мовы. Часта ўдзельнічаю ў краёвых і замежных канферэнцыях, дзе выступаю з дакладамі пра беларускую літаратурную мову. Прымала ўдзел у I і II Міжнародных кангрэсах у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка і ў III Міжнародным кангрэсе беларусістаў. З'яўляюся членам краёвых і замежных арганізацый беларусістаў і славістаў. Публікую артыкулы пра развіццё беларускай літаратурнай мовы 1920-х і 1930-х гадоў.

— А ў сваёй сям'і на якой мове Вы размаўляеце?

— У жыцці мы размаўляем на польскай мове, але мае сыны ведаюць і беларускую мову, хоць не так дасканала, як я, але ж ведаюць. Ды і мне самой цяпер прыходзіцца рэдка размаўляць на сваёй роднай мове, часцей за ўсё падчас беларускіх сустрэч, навуковых канферэнцый і г.д. Але, шчыра скажу, Беларусь і беларусы для мяне вельмі блізкія. Кожны раз, калі пабываю ў Мінску, мне здаецца, сустракаюся з такой цеплынёй, якую чалавек атрымлівае толькі ад самых блізкіх людзей. Уладзімір Васілевіч, мой дарагі сябра, з якім Вы таксама знаёмыя, і які калісьці прыязджаў у Сідар-Фолс і прачытаў даклад пра беларускую этнаграфію, заўсёды мне дапамагае, калі я ў Мінску.

— А ці часта бываеце ў Гайнаўцы на Беласточчыне?

— Амаль кожны год я з мужам прыязджаю ў Кракаў, дзе муж вядзе заняткі па гісторыі, а я выкладаю польскую мову. А летам мы едзем у Гайнаўку да маёй мамы. Вось і сёлета ў чэрвені зноў наведаем маму. Асабліва ў Гайнаўцы любяць бываць мае сыны. А я — тым болей, я ж прыязджаю дадому, дзе чую голас мамы, сваякоў і родную мову.

Сяргей ЧЫГРЫН

СА СВЯТАМ

Надыходзячае Свята Уваскрэсення Гасподняга гэта радасныя дні ў хрысціянскім календары. Няхай будуць яны для кожнага з нас нагодай адрадзіць у сабе ўсё, што найлепшае, і перамагчы зло — так, як паказаў нам Ісус Хрыстос. Няхай кожны правядзе гэты святочны час у цяпле любові, акружаны радасцю і шчасцем.

Тадэуш Трускаляскі
Прэзідэнт горада Беластока
Владзімеж Лешак Кусак
Старшыня Гарадской рады Беластока

19.04 — 25.04

(22.03. — 20.04.) Адчуеш сябе як нованароджаны. Будзеш вулканам энергіі. Можаш шмат зрэалізаваць. З 24.04. не разлічвай на тое, што шэф будзе глядзець праз пальцы. З 25.04. пачнуцца новыя магчымасці. Найбольш заробіш у трэцяй дэкадзе красавіка.

(21.04. — 21.05.) Кан'юнкцыя Венеры з Марсам (20-24.04.) дадасць жару любоўным прызнанням. Не адной асобе можаш закруціць у галаве. З новапазнанай асобай адчуеш сябе як у небе. Вельмі добрыя сустрэчы. З 20.04. — больш самаўпэўненасці.

(22.05. — 22.06.) Ваганне паміж ахвотай зашыцца кудысьці ў куточак, або актыўна загуляць у кампаніі. Асабліва прыемныя сустрэчы пачнуцца ў канцы тыдня. 21-25.04. твае добрыя парады не будуць прыняты з удзячнасцю. Тваё перакананне аб сваёй беспамылковасці можа цябе асмяшыць.

(23.06. — 23.07.) Ідэальны час на сустрэчы з сябрамі. Мілым спатканням не будзе канца (аж да канца месяца). Камерная астмасфера паправіць табе настрой. У каханні будзеш не толькі жарсны і моцны, але і захопніцкі.

(24.07. — 23.08.) Да 22.04. будзеш задзіраць нос, але і пабойвацца (таму будзеш нахабны). Могуць паявіцца нагоды, аб якіх мог бы ты толькі памарыць. 21-25.04. — ідэальны час на цяжкія вырашэнні і дзеянні патрабуючыя засяроджанасці, адчаю і упартасці. Але з 23.04. (аж да 27.04) не будзеш мець вялікай моцы пераконвання; пагражаюць табе канфлікты.

(24.08. — 23.09.) Інтэнсіўна праведзены час, але хоць шмат будзе адбывацца, адпачнеш і адновіш сілы. Не засяроджвайся на дэталях, ахапляй усё цэласна. З 24.04. пачнецца ненайлепшы час на афармлянне спраў ва ўстановах, расчараванні, горыч (хоць здароўе неблагое). Дзевы народжаныя да 27.08. могуць непланавана зацяжарыць.

(24.09. — 23.10.) Кан'юнкцыя Марса з Венерай (20-24.04) — знакаміты час на рандэву, сустрэчы, у фінансах. Але не ўсе планы зрэалізуеш. Не дасі рады ўцячы ад таго, што занядбаў. У пары схочаш паставіць на сваім. Зробіш тое, што для цябе найважнейшае. Хоць не дзейнічай імпульсіўна. Шалі народжаныя ў верасні мусяць быць вельмі асцярожныя.

(24.10. — 22.11.) 21-25.04. будзеш рашучы, з моцнай воляй. Добры час на перамовы і фарсіраванне ўласных намераў. З 24.04. (да 28.04.) пачнецца для цябе час багаты ў небяспечныя падзеі. З-за неасцярожнасці можаш зрабіць такую памылку, якую вельмі цяжка будзе выправіць. Адчуеш веснавую стому.

(23.11. — 22.12.) Рассеянасць, а прытым самаўпэўненасць. Празмерная колькасць спраў, з якімі маеш справіцца, давядзе да таго, што можаш не асягнуць таго, на чым табе найбольш залежыць. Кантралюй выдаткі і не давай блізкім раскідвацца грашыма. Затое ў апошняй дэкадзе красавіка можа зноў успыхнуць прыгаслае каханне!

(23.12. — 20.01.) 21-25.04. будзеш у найлепшай фізічнай і псіхічнай форме. Устойлівы на боль і ўдары лёсу, дойдзеш да вызначанай мэты. На медычныя абследаванні ідзі з 24.04. (вынікі найбольш верагодныя), хоць у той час будзеш злосны і сварлівы.

(21.01. — 19.02.) 22-26.04. найлепшыя кантакты з людзьмі, лёгкасць у рэалізацыі планаў, цікаўнасць да свету і людзей. У каханні павядзе цябе інстынкт. У сардэчных справах не будзе для цябе немагчымага. Затое з 23.04. (да 27.04.) папсуюцца табе хатнія і прыватныя справы, праз адну гісторыю з мінулага.

(20.02. — 21.03.) Слухай выключна свае інтуіцыі. Не ўсё пойдзе па тваёй думцы. Не так зразумееш чыесьці словы, што выкліча лавіну памылак. Рыб народжаных 13-18.03. рэвалюцыйны Уран заахвоціць да радыкальных крокаў. Экстра фінансавыя нагоды.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960